З лесу ў лес ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Мікола Мяжэнны ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 50 (2796) Год LIV | Беласток, 13 снежня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Не хочам адходаў

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Ужо будуецца Прадпрыемства гаспадарання адходамі побач вуліцы Парыева ў Гайнаўцы. Прадбачваецца, што будуць перасартаваныя ў ім усе адходы, якія знаходзяцца зараз на высокай гурбе

Што рабіць з адходамі? — такое пытанне сталі цяпер ставіць войты, бурмістры і гмінныя чыноўнікі. Вельмі жорсткія еўрасаюзныя законы наконт утылізацыі адходаў прымушаюць гмінныя самаўрады да такога іх сартавання, каб можна было вылучаць з усяго смецця адходы прыдатныя для паўторнага іх выкарыстання ў прадукцыі. Са смецця, якое нельга будзе ўжо паўторна выкарыстаць, трэба яшчэ выдзяляць арганічныя кампаненты, а ўсе апошнія адходы будуць складвацца на нейтральных для асяроддзя звалках, спецыяльна падрыхтаваных для іх перахоўвання на доўгія гады або спальвацца ў нейтральных для асяроддзя кацельнях. Ужо будуецца Прадпрыемства гаспадарання адходамі побач вуліцы Парыева ў Гайнаўцы, але няма яшчэ ў Гайнаўскім, Бельскім і іншых нашых паветах ні такіх нейтральных для асяроддзя звалак, ні такіх нейтральных кацельняў (прадбачваецца збудаваць кацельню ў Беластоку). Гаспадаранне адходамі ў Гайнаўскім павеце можа моцна ўскладніцца з пачатку 2010 года, калі маюць быць закрыты звалкі смецця ў Белавежскай, Дубіцкай, Кляшчэлеўскай, Чаромхаўскай, Чыжоўскай і Гайнаўскай вясковай гмінах. Калі ўзніклі планы інвестыцый, што маглі б вырашыць праблему ўтылізацыі адходаў у нашых вёсках і гарадах, то покі няма згоды прынамсі часткі мясцовага насельніцтва на такія прапановы.

Гмінам аднаго павета не пад сілу рэалізацыя згаданых інвестыцый і таму самаўрадаўцы з Бельскага, Гайнаўскага і Сямятыцкага паветаў заснавалі Камунальны саюз гмін рэгіёна Белавежскай пушчы. Яшчэ вясной 2008 года гэты саюз вырашыў будаваць Прадпрыемства гаспадарання адходамі і нейтральную для асяроддзя звалку побач вёскі Дубяжын і пад новую інвестыцыю былі нават адведзены вялікія ўчасткі зямлі. Аднак супраць такога рашэння выступілі жыхары вёсак Дубяжын і Падбелле.

— Улады прымаюць рашэнні, аб якіх нас не інфармуюць, — жаліліся жыхары згаданых вёсак. Калі не дачакаліся станоўчага вырашэння іх просьбы, у чэрвені 2008 года жыхары Дубяжына і Падбелля выступілі з пісьмовай просьбай да ўлад сваёй і суседняй гмін, каб перанеслі іх вёскі з Бельскай гміны ў Арлянскую. Тлумачылі, што рашыліся на такі крок, бо разам з новай інвестыцыяй паявіцца небяспека для іх здароўя і жыцця. Хаця жыхары згаданых сёлаў не дабіліся змены адміністрацыйных межаў згаданых гмін, то сваімі стойкімі дзеяннямі спрычыніліся да спынення планаванай інвестыцыі каля Дубяжына.

Хаця і цяпер у ваяводскіх планах добраўпарадкавання тэрыторый надалей знаходзіцца запіс аб будове на землях вёскі Дубяжын Прадпрыемства гаспадарання адходамі і нейтральнай для асяроддзя звалкі, то прынамсі самаўрадаўцы з Гайнаўшчыны рашыліся даўжэй ужо не чакаць інвестыцыі ў Дубяжыне, толькі ўзяць справы ў свае рукі. У Гайнаўскім павеце з канцом 2009 года канчаюцца дазволы на карыстанне гмінныя звалкамі смецця, за выключэннем гайнаўскай, нарваўскай і распаложанай у Альхоўцы (Нараўчанская гміна) звалак, але і ў выпадку гэтых мясцовасцей ёсць толькі згода на некалькігадовае іх выкарыстанне. Зараз вядома, што ўлады Гайнаўкі, Нарвы і Нараўкі не згаджаюцца на складванне на іх тэрыторыі адходаў з суседніх гмін. Аднак аб тым, што можа быць у галіне гаспадарання адходамі з пачатку 2010 года было вядома прынамсі ад некалькіх гадоў.

У Гайнаўскім павеце бытавыя і прамысловыя адходы забіралі камунальныя прадпрыемствы Гайнаўкі, Бельска-Падляшскага і далейшых мясцовасцей. Калі яны маюць падпісаныя дамовы на складванне сваіх адходаў на нейкіх звалках, то многа ў дзейнасці гэтых камунальных суполак ад 1 студзеня 2010 года не павінна памяняцца. Затое, напрыклад, нашы гаспадары з Белавежскай, Дубіцкай, Кляшчэлеўскай, Чаромхаўскай, Чыжоўскай ці Гайнаўскай вясковай гмін і прадпрыемствы ці суполкі, што там дзейнічаюць, могуць мець клопаты, каб легальна пазбыцца большых колькасцей адходаў, па-за раней падпісанымі дамовамі, калі будуць закрыты звалкі смецця на іх тэрыторыі. Нават пасля рамонтных работ трэба ж пазбыцца недзе друзу і смецця.

— Мы размаўляем і шукаем, дзе будзе можна складваць нашы адходы, але покі не знайшлі такога месца, — заявіў Дарыюш Дуткоўскі, намеснік войта Белавежскай гміны.

— У нашых лясах і равах могуць масава паяўляцца нелегальныя звалкі смецця, — лічаць песімісты. Хаця ў гэтай справе аптымісты прэзентуюць іншую думку, то цяжка будзе пазбегнуць выкідання непатрэбных адходаў на прыроду.

— Мы лічым, што каля Дубяжына ўзнікне нейтральная для асяроддзя звалка адходаў, — лічыць бурмістр Кляшчэляў Аляксандр Сяліцкі, — а покі нашы самаўрадаўцы выступілі да Міністра асяроддзя з просьбай падоўжыць час дзейнасці старых звалак у гмінах Гайнаўшчыны.

Ужо будуецца Прадпрыемства гаспадарання адходамі побач вуліцы Парыэва ў Гайнаўцы. Відаць, як з зямлі вырастае новая канструкцыя, а побач вядуцца земляныя работы. На цяперашнім месцы складвання адходаў побач Парыева распачалася рэкультывацыя тэрыторыі побач высокай звалкі смецця. Прадбачваецца, што ў новазбудаваным прадпрыемстве будуць перасартаваныя ўсе адходы, што знаходзяцца зараз на высокай гурбе і каля яе, прысыпаныя зямлёй. Пасля рэкультывацыі ўся тэрыторыя мае быць засаджана расліннасцю, а побач яе гаспадары будуць выкарыстоўваць палі для сельскагаспадарчай прадукцыі. Каб пазбыцца адходаў складваных у некалькіх соцень метрах ад раскінутых па полі дамоў і непадалёк ад людскіх сядзіб распаложаных па вуліцы Парыева і на арэшкаўскіх хутарах, іх жыхары доўга хадайнічалі перад гарадскімі ўладамі Гайнаўкі з просьбай ліквідаваць звалкі. Прыходзілася ім таксама нават пратэставаць у гэтай справе.

Працягваюць свой пратэст жыхары часткі гайнаўскага квартала Юдзянка, Хітрай і Прагалёў. Імкнуцца яны не дапусціць да будовы на Гурнянскіх лугах нейтральнай для асяроддзя звалкі адходаў няздатных для паўторнага выкарыстання ў прадукцыі. Пасля сустрэчы з гарадскімі ўладамі (апісвалі мы гэта ў „Ніве") сабралі яны 150 подпісаў жыхароў супраць размяшчэння звалкі адходаў на згаданай тэрыторыі. Ліст з пратэстам выслалі яны ў гарадскую ўправу, управу Гайнаўскай вясковай гміны, на якой тэрыторыі распаложаны Хітрая і Прагалі, да міністра асяроддзя, у Маршалкоўскую ўправу, Рэгіянальную дырэкцыю аховы асяроддзя і паведамілі аб сваіх апасеннях эколагаў. Мясцовыя людзі тлумачаць, што баяцца некарыснага ўздзеяння новай інвестыцыі на асяроддзе.

Пратэстуючыя асобы раяць у бліжэйшым часе высылаць з ПГА непрыдатныя для паўторнага выкарыстання ў прадукцыі адходы ў кацельню прыстасаваную да іх спальвання. Аднак такой у бліжэйшым наваколлі няма, а толькі мае будавацца ў Беластоку.

Культурны цэнтр Беларусі пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча

запрашае на адкрыццё выставы графічных постэраў

Сяргея Стэльмашонка,

якое адбудзецца 14 снежня 2009 г. а 16.00 гадзіне па адрасе ul. Modlińska 2, 15-066 Białystok

ЗАПРАШАЕ

Аб'яднаньне Бацькоў

Stowarzyszenie na rzecz dzieci i młodzieży uczących się języka białoruskiego „AB-BA"

Сардэчна запрашаем на спектакль „Сейненскія хронікі" ў выкананні моладзі з Асяродка Пагранічча ў Сейнах.

Месца: спартзала ПШ № 4 у Беластоку, вул. Чэнстахоўская, 6а

11.12.2009, гадз. 18.00

Пасля спектакля адбудзецца сустрэча з апякункай тэатра Бажэнай Шрэдар.

9 770546 196000

Зашмальцаваная калода

Кадры, як вядома, „решают всё". Гэтую сакраментальную мудрасць упраўлення краінай вынайшаў яшчэ бацька ўсіх народаў. Верным яго паслядоўнікам з'яўляецца кіраўнік сучаснай беларускай дзяржавы. На мінулым тыдні Аляксандр Лукашэнка чарговы раз перакартаваў сваіх тузоў, валетаў і шасцёрак. Тыя выгнуліся і пакорліва перарыентаваліся. Паспрабаваў бы хто адмовіцца ці аспрэчыць новае прызначэнне! Калі раней кадры памыляліся, яны адразу адпраўляліся туды, дзе растуць кедры. І яшчэ далей — на перакоўку. Зараз кадры, паводле вобразнага выказвання новага класіка, проста „ператрахіваюцца". Затое рэгулярна. Каб не заседжваліся і не стваралі кланаў і груповак.

Наменклатура вышэйшага эшалона Рэспублікі Беларусь усё больш нагадвае зашмальцаваную калоду картаў. Ёсць катэгорыя незаменных людзей, якія могуць справіцца з кожным заданнем, якое паставіць вярхоўны галоўнакамандуючы. Вось і картуюцца і кантуюцца гэтыя чыноўнікі, не зважаючы на іх адукацыю, профіль, жаданні і прафесійныя здольнасці. Кожны з іх, калі спатрэбіцца нашай магутнай працвітаючай дзяржаве, будзе і швец, і жнец, і на дудзе ігрэц. Што тут скажаш — сапраўдныя ўніверсалы. Прыкладам, Міхаіл Мясніковіч некалі быў намеснікам прэм'ер міністра, потым кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта, а зараз кіруе толькі Акадэміяй навук. Ды што там нейкая навука! Вось Віктар Шэйман доўгі час быў генеральным пракурорам, нават не маючы юрыдычнай адукацыі. Праўда, потым масць лягла іншая, давялося прымаць і іншы „адказны ўчастак" работы. Не першы раз перамяшчаюцца на высокіх пасадах Леанід Мальцаў і Юрый Жадобін. Цяпер першы будзе дзяржсакратаром Савета Бяспекі, а другі міністрам абароны. Нават аналітыкі стаміліся адсочваць рознага кшталту кадравыя перастаноўкі і ракіроўкі.

Можа хто і хацеў бы саскочыць з цягніка, але „наш паровоз вперёд летит". На прыпынкі няма часу, ды і права зысці няма. Так што „иного нет у них пути". Тым больш, што ад царскага гневу да барскай літасці і ласкі адзін крок. Вось Аляксандр Бароўскі, колішні кіраўнік канцэрна „Белнафтахім", зусім нядаўна — у сакавіку 2008 года — быў засуджаны да 5 гадоў турэмнай калоніі і на тры гады пазбаўлены права займаць кіроўныя пасады ў дзяржаўных арганізацыях і прадпрыемствах. Але прайшло толькі паўгода і апальны дырэктар быў памілаваны высокім указам, а вось зараз прызначаны генеральным дырэктарам вытворчага аб'яднання „БелаўтаМАЗ". Можна, канешне, і адваротна загрымець, але пераважна праверана „абойма" не мяняецца і без хлеба не застаецца. Аднак, як там вучылі ў школе — ад перамены месцаў сума не мяняецца.

Знаходзіцца сярод гэтай стракатай „тузоўкі" і чырвовая дама. Маладая і поўная творчых стваральных сілаў Наталля Пяткевіч на мінулым тыдні яшчэ раз пацвердзіла, што галоўнае ў Рэспубліцы Беларусь — гэта мацаваць ідэалогію. Сціснуць у кулаку галоўныя вартасці і трымаць цвёрда. Ужо чыноўнікі ніжэйшага роўню парупяцца і папрацуюць. Гэтыя дык будуць біць у хамут і трымацца за свае крэслы да апошняга. Як некалі казалі, не дай Бог свінні рог, а мужыку панства. Цяжкі іх хлеб, але досыць пажыўны.

І, будзьце пэўнымі, кожны з перасеўшых у новае крэсла ні на крок не адхіліцца ад генеральнай правільнай лініі. Хутчэй пралескі зацвітуць у снежні, чым новы міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі дасць „распусціцца" незалежнай прэсе. Так і іншыя.

А вам не здаецца падазроным, што так доўга засядзеўся ў прэм'ерскім крэсле Сяргей Сідорскі, намінальна другая асоба ў дзяржаве? Тут толькі дзве версіі. Альбо гэта адзін з нямногіх сапраўды прафесіяналаў, якога перамяшчаць у іншае месца папросту невыгодна, альбо ў вельмі крытычны момант яму падрыхтавана роля ахвярнага казла. Зрэшты, адно другога не выключае.

У выніку жа ўсіх кадравых перастановак, як не картуй гэтую зашмальцаваную калоду, каралі ў ёй спрэс голыя, валеты недалёкія, дамы маюць адпаведную рэпутацыю, а пераважаюць усё больш шасцёркі.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

2009 год (1)

Бяжыць, спяшаецца час. На лічыльніку маем канец 2009 года. На нашых лічыльніках таксама прыбыло. Ой, як хутка ўцякае час.

Як я бачу мінаючы год у вузкім і шырэйшым вымярэнні?

Пачну з сябе і спадарожніцы сваёй Марыі Канстанцінаўны. Жывем мы далей на старым месцы, са старымі звычкамі і поглядамі. Аптымістычна выкарыстоўваем тое, што асталося яшчэ нам да выкарыстання і памаленьку змагаемся з рознымі хворасцямі. Стараемся жыць гігіенічна і старэць аптымістычна, каб спакойна закончыць увесь цыкл нашага людскога існавання.

Лічу, што наракаць на сваё жыццё мы з жонкай не маем права. Нарадзіліся мы і раслі ў поўных і згодных сем'ях. Бацькі нашы давялі нас да дарослацці, памаглі здабыць адукацыю, прафесію, вывелі — як кажуць — нас у людзі. Потым мы ўжо самі працавалі, пажаніліся і не з прынукі, а па ўласнай вольнай волі і ахвоце. Потым радзілі, расцілі, выхоўвалі і выводзілі ў людзі ўжо сваіх дзетак. І дагадоўвалі, і хавалі сваіх бацькоў...

Цяпер дзеткі нашы ўжо дарослыя, маюць адукацыю, адказныя пасады і сваё ўласнае дарослае жыццё. Частку сваіх жыццёвых этапаў і яны ўжо прайшлі, частка перад імі. Адным словам і яны паўтараюць адвечны біялагічны кругаварот...

Як дзеці і бацькі мы больш-менш, здаецца, спраўдзіліся. І чаго ж нам больш патрабаваць ад жыцця? А паколькі кола нашага жыцця яшчэ не самкнулася, трэба і надалей жыць і сямейнымі, і грамадскімі ды нават палітычнымі справамі. Ад іх нікуды не ўцячэш, ды і ўцякаць не трэба, бо што вартае жыццё без іх?..

Большая ўвага дзядоў накіравана часцей на ўнукаў, чым на дзяцей. Бо і больш удалай з'яўляецца кампанія і дружба паміж найстарэйшым і наймалодшым пакаленнямі. Можа таму, што яны разумова найбольш блізкія сабе.

У нас з бабкай унукаў двое. Вось і „танчым" пад іх музыку. Бабка проста складаныя „піруэты" перад імі выкручвае. Усе іх удачы і няўдачы з імі і за іх перажываем. Прынясе меншы „сонейка" з прадшколла — цешымся, прынясе „хмарку" — перажываем. Падобна і са старэйшым. Усёй сям'ёй рыхтавалі яго ў школу — у першы клас. Першы школьны дзень „адпіцаванага" яго ўрачыста адвялі ў школу тата з мамай і з нецярпеннем чакалі ўсе мы яго ўражанняў ад першага школьнага дня. Уражанні ў нашага шкалярыка-першакласніка атрымаліся аднак ненайлепшыя. Адзін такі ж шкалярык-першакласнік пацягнуў яго за валасы і назваў пупай... Як ён так мог зняважыць нашага хлопчыка?! І то на пачатку яго навуковай дарогі. І як тут не будзеш перажываць і нервавацца?..

Наша Гайнаўка ў 2009 годзе мелася таксама даволі добра. Яна надалей знаходзіцца на тым месцы, што і раней была. Яна чыстая, зялёная, ціхая, спакойная і шматканфесійная. Тут прыгожыя цэрквы, касцёлы і дамы малітвы ці як там іх назваць. Не ў назве ж святасць іх. Калі мы пры святой тэме, абавязкова трэба сказаць і пра тры нашы могільнікі: праваслаўны, каталіцкі і вайсковы. Усе яны прыгожыя, дагледжаныя і прасторныя. Усе яны распаложаны, можна сказаць, у пушчы, што з'яўляецца таксама немалым козырам іх. Не ўступае могільнікам і пахавальны рытуал, праўда, не бясплатны. Ды што цяпер бясплатна?! Вось і выбірай, чалавеча, што табе больш падабаецца.

Вайсковыя могілкі былі сёлета адноўлены, упарадкаваны і заменены на іх помнік свецкага характару з часоў народнай улады помнікам рэлігійнага зместу. І ўсё было б нічога, каб надпісы на новым помніку былі больш чытэльныя і без памылак. Нядобра, калі помнік славіцца не сваёй архітэктурай, святасцю, а дэфектамі.

Трэба пахваліць таксама раскошныя гайнаўскія магазіны: каўфлянды, бядронкі, аргеланы, далікатэсы. Прыгожы і заўсёды чысты наш парк з амфітэатрам і беларускі музей, у якіх вельмі часта адбываюцца розныя культурныя мерапрыемствы. Фіналізуецца будова вялікага, прыгожага крытага басейна. Добра і спакойна жывецца ў нашым горадзе. Не менш спакойныя і прыгожыя месцы — як бачыце — чакаюць гайнавян і пасля смерці...

А вось у дарагой краіне нашай не так усё прыгожа і гладка. У сейме і сенаце грызня, у масмедыях таксама, у эканоміцы крызіс, а на могільніках — цеснота...

(працяг будзе)

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

„Main Kampf" у „Ксёжніцы"

Нядаўна трапіў я ў біліятэку-пазычальню ў „Падляшскай ксёжніцы", у якой я даўно ўжо не быў. Калі размаўляў з адной з працаўніц, да іншай, побач, падышоў (на вока) каля 17-гадовы чалавек: „Chciałem pożyczyć „Mein Kampf"!

Пасля звычайнага запаўнення маладзёнам адпаведных фішак, бібліятэкарка ўзабралася на трэці паверх, дзе ў бібліятэчных фондах захоўваецца гэты ідэалагічны маніфест Адольфа Гітлера, і прынесла яго хлапцу без лішніх пытанняў. Я быў ашарашаны. Урэшце ж друкаванне і распаўсюджванне гэтай кнігі ў Польшчы — нелегальныя. Пад паняццем распаўсюджвання — на маю думку — несумненна змяшчаецца таксама распаўсюджванне ў публічным абарачэнні, якім без сумнення з'яўляецца пазычанне „Mein Kampf" у бібліятэках, у гэтым выпадку ў „Ксёжніцы", падлягаючай ваяводскаму самаўраду. Ад працаўніцы гэтага падляшскага бібліятэчнага цэнтра я пачуў:

— „Mein Kampf" таксама можна пазычыць у іншых бібліятэках краіны. У нас ёсць польскамоўнае выданне з 1992 года.

Устрывожаны, пазваніў я вядомай мне дэпутатцы ад ГП Малжагаце Кідаве-Блонскай, якая з'яўляецца членам камісіі культуры пры камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей.

— Гэта сама найменш дзіўнае. Буду гэта высвятляць, — абяцала дэпутатка. Лаўлю яе на слове. Тым больш, што пры нагодзе прыгадалася мне здарэнне, якое мела месца больш за тры гады таму, калі ўспыхнуў скандал пасля таго, як журналісты адной з агульнапольскіх газет купілі „Mein Kampf" без праблем у адным з познанскіх кніжных магазінаў. У той час прэс-сакратар Акруговай пракуратуры ў Варшаве Мацей Куяўскі казаў:

— Гэта парушэнне 256 артыкула крымінальнага кодэкса. Распаўсюджванне „Mein Kampf" забаронена [ці „распаўсюджанне" гэта толькі продаж, ці таксама даступнасць у агульнадаступных бібліятэках? — М. Х.]. У гэтым выпадку маем абгрунтаванае падазрэнне ў злачынстве. Пагражае за яго пакаранне да двух гадоў.

На думку юрыстаў, якія тады выказваліся, можа выклікаць разнагалоссе тое, ці сёння тэкст Гітлера з'яўляецца прапагандай нацызму. Аднак, як яны адзначылі, права мусіць быць скрупулёзна захоўваным. На маю думку, хоць не з'яўляюся юрыстам, таксама павінен датычыць і публічных бібліятэк успомнены прэс-сакратаром Куяўскім артыкул крымінальнага кодэкса, які гаворыць пра „публічнае прапагандаванне фашысцкага або іншага таталітарнага дзяржаўнага ладу" або „закліканне да нянавісці на глебе нацыянальных, этнічных, расавых, канфесійных адрозненняў або па прычыне бесканфесійнасці". Больш-менш у час познанскай афёры тадышні віцэ-міністр унутраных спраў і адміністрацыі Владыслаў Стасяк (сёння міністр у Канцылярыі прэзідэнта Леха Качынскага) у адказ на адну з дэпутацкіх інтэрпеляцый на тэму нелегальнага распаўсюджвання расісцкіх і неанацысцкіх ідэй у інтэрнэце адзначыў:

— Польская юрыдычная сістэма не дазваляе публічным установам на збор даных датычных расавай дыскрымінацыі і ксенафобіі.

Варта тут дадаць, што ў Польшчы надалей вядзецца Праграма супрацьдзеяння расавай дыскрымінацыі, ксенафобіі і звязанай з імі неталерантнасці. Спасылаецца яна непасрэдна на міжнародныя абавязацельствы нашай краіны, значыць, на адпаведныя дакументы ААН. А мы ў Беластоку з аднаго боку маем працэсы асуджаючыя маладых абвінавачаных у злачынствах на расісцкай глебе, з другога — іншыя маладыя (можа і тыя асуджаныя) могуць вывучаць фашысцкую біблію.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

З лесу ў лес

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Перад Елянкай і колішнімі могілкамі, своеасаблівы крыжастас са своеасаблівай каплічкай у цэнтры яго

Заўсёды, калі праязджаю праз Елянку, задзіўляе мяне комплекс крыжоў на пачатку мясцовасці з боку Дубіч-Царкоўных. І вось злажу з аўтобуса ў гэтай вёсцы і падаюся ў той інтрыгуючы бок. Аднак пры дарозе стаяць і іншыя крыжы, падыходжу да першага з іх, да чарговых у асобнай агароджы. На іх малітоўныя надпісы захаваць вёску ад усялякіх няшчасцяў. Далей, перад колішнімі могілкамі, своеасаблівы крыжастас са своеасаблівай каплічкай у цэнтры яго. Каплічку тую, мабыць, ставілі з найбольшым малітоўным уздымам, без аглядкі на ўсялякія багаслоўскія выдумкі пра кананічнасць. Бо ж у той каплічцы характэрная заходняму хрысціянству фігурка, а наверсе ўсходнехрысціянскі крыж. Таму можа здзіўляць супастаўленне гэтай рэлігійнасці з тым няшчасцем, якое ўпала на Елянку пяць гадоў таму, калі тарнада сарвала пакрыцці з усіх вясковых будынкаў. Быццам тая шчырая рэлігійнасць ад ніякага няшчасця не засцерагае. Хто ведае, можа тут было так, як з біблейскім Іовам, можа было гэта выпрабаванне жыхароў вёскі ў моцы іх веры.

Цяпер Елянка адбудаваная, на ўсіх будынках новыя бляшаныя дахі. Але вялікага гаспадарання тут не відаць. На двух панадворках заўважыў я бітонікі для малака, а гэта абазначае, што там яшчэ трымаюць мо па дзветры кароўкі, каб сабе мець свежае малако, а лішак па прывычцы завозіць у пункт прыёму; пазней даведаюся, што ў Грабавец. На некаторых панадворках паказваюцца людзі, спыняюся каля аднаго мужчыны, які акурат выйшаў да брамкі на вуліцу, пытаю пра вясковае гаспадаранне.

— Калісь ад Елянкі да Сакоў і да Курашава былі палі. А цяпер лес, звярына да вёскі падыходзіць. Людзі учэпліваюць сабак каб страшыць звярыну, але і гэта не дае выніку, бо сабак ваўкі з'ядаюць; аднаго году то каля дзесяці сабак з'елі. Ну, якіясь мутанты з ваўкоў парабіліся, ці што, бо калісь такога не было.

Пытаю пра колішнія могілкі, пра цяперашнія. Наконт гэтых апошніх чую прыказку: „Гдзе баба жондзі, там д'ябэл блондзі". Бо новыя могілкі мелі быць побач вёскі, а тры бадай бабы выдумалі, каб далей. І яны далей, каля паўкіламетра за вёскай.

Кіруюся ў бок Сухавольцаў — адлегласць каля пяці кіламетраў, і ўсё лесам. Лес тут не стары, большасць ягоных дрэў пачала ўзрастаць разам з „другой Польшчай". Сям-там расце маладняк, адзіны неаблесены ўчастак акурат узараны пад пасадку. У старэйшым лесе паваленых дрэў ніхто не чапае, быццам быў там прыродны запаведнік; мо няма ўжо каму займацца такімі дробязямі.

Перад Сухавольцамі кіруюся загуменнай вулачкай у напрамку тамашняй царкоўкі. За вёскай каратаю дарогу цераз колішнія ямы, у якія людзі калісь хавалі бульбу на зіму. Ямы тыя так і асталіся, амаль не пастарэлі, быццам надалей трымаюцца ў страі і зараз гатовыя выконваць сваю колішнюю ролю. Адно на тым вясковым грунце параслі цяпер буйныя акацыі з велізарнымі шыпамі, быццам вахцёры сцерагучыя тых выкапаных у зямлі помнікаў мясцовай сельскагаспадарчай мінуўшчыны. Прабіваюся па тым забытым людзьмі месцы быццам сапёр праз загарадзі з калючага дроту, зважаючы, каб і ступаць асцярожна, каб не ўваліцца ў якую яму.

Ад могілак, на якіх стаіць згаданая царкоўка, іду ў вёску. Малады лясок падыходзіць да крайніх збудаванняў, што з боку Кляшчэль. Перад першай крамай — а ў Сухавольцах іх дзве — спыняюся побач двух мужчын, пытаю іх пра мураваную іхнюю вёску...

— Цагельня была ў Кляшчэлях, там вельмі добрую цэглу выпальвалі, — расказваюць мне. — Некаторыя хаты ў Сухавольцах пабудаваны і з арлянскай цэглы — яна больш светлая, менш выпаленая. І крыху цэглы з Сакоў — тады калі там школу будавалі; была там тады цагельня. А да вайны паміж Елянкаю і Кляшчэлямі таксама была цагельня, але з яе толькі на печы матэрыял бралі. Царкву ў Сухавольцах пабудавалі каля дзесяці гадоў таму. На ямах расце акацыя, а ямы калісь кожны ведаў, дзе яго, а дзе суседская.

Амаль усе хаты ў Сухавольцах стаяць фронтам да вуліцы. І амаль усе мураваныя. Перад некаторымі характэрны ганак. Мужчыны сказалі мне, што хаты ў іхняй вёсцы — у тым ліку і ганкі — будавалі розныя майстры, а на такі а не іншы выгляд ганкаў пайшла была тады такая мода.

У Сухавольцах пункт прыёму малака здаецца быць пустым. А пры дарозе да яго малады чалавек пракопваў раўчак, я падышоў да яго, спытаў, ці ён мясцовы; ён пацвердзіў. Тады я да яго пачаў па-свойму гаварыць, а ён сказаў, што не разумее. І высветлілася, што ён купіў у Сухавольцах хату, а сам з жонкай з Беластока. Прыязджаюць па ўік-эндах, у вольны час і рыхтуюць тут сабе гняздзечка на пажылыя гады.

Кругагляд між Сухавольцамі і Сакамі закрываюць мо трыццацігадовыя лясы на ўзгорках, а па схілах узгоркаў распаўзаецца чарговае пакаленне лясоў — сасновыя і бярозавыя пасадкі і самасеі. Шмат палеткаў за Сухавольцамі абсаджаны ароніяй або парэчкамі. Але ёсць і шмат аблагоў, якія чакаюць аблясення, далучэння да ўсё пашыраючайся слаўнай Белавежскай пушчы.

У былым школьным будынку ў Сакох перакрыты дах, перарабляюцца вокны на царкоўны лад — з паўкруглым верхам. Але гэта толькі пачатак, толькі асновы. Агароджа навокал былой школьнай нерухомасці разваленая, а яна ж вакол будучага манастыра павінна быць шчыльная-шчыльная, каб ніякія грэшныя спакусы ў манастыр не пралезлі...

Сама вёска ў познюю восень выглядае непрывабна, яе планіроўка нерэгулярная. Але вясною ці летам там напэўна шмат зелені, бо Сакі распаложаны сярод тых нізоўяў, якія даюць вытокі рэчцы Белай. Балоцістыя тыя нізоўі, нават вольхам там макравата і падымаюць свае камлі высока над грунтам, быццам нейкія балерыны ножкі, гуляючы „Танец лебедзянят" Чайкоўскага.

Крама ў Сакох адкрываецца два разы ўдзень, вядзе яе адна сям'я. Відаць крыху гаспадарак, нават буйных, але і шмат вельмі запушчаных хат. Шчыльна загароджаны тартак на месцы былога эскаэру; уласнік тартака недзе з поўдня Польшчы. Ёсць вясковы клуб.

Паміж Сакамі і Тапарамі могілкі. І царква там, з асобнай званіцай, распаложаная на схіле ўзгорка. У агульным плане гэты ўзгорак і царква нагадваюць Грабарку. Невыпадкова хіба свята Спаса прыцягвае і ў Сакі шмат вернікаў.

У Тапарах прыглядаюся хаце са старой шыльдай „Руху". А мне прыглядаецца мужчына сярэдніх гадоў. Пытае мяне, ці не з газеты. — З газеты. — А з якой? — А адгадайце. — З „Фактаў і мітаў"? — Не, з „Нівы". — Вы то пра скандалы не напішаце. — А што: якіясь скандалы тут ёсць? — Ну, вы павінны пра гэта ведаць. У манастыры мо з месяц таму настаяцеля пагналі. — А што сталася? — А я гэтага не скажу; людзі ўсяляк гавораць, але невядома колькі ў гэтым праўды. Гаварыць я не буду, а калі хочаце што даведацца, то пытайце ў Савы дазволу, тады мо я што і скажу.

Вось, кругом сакоўскага манастыра быццам у раю. Яблынька там расце ведання добрага і благога. Ды не кожны можа пачаставацца спакуслівым веданнем, не кожны хоча раскрыць толькі там вядомую тайну. Ды, калі добра разгледзецца, не толькі ў наваколлі Сакоў рай. Кругом рай, які няспынна вабіць цяперашніх Еў і Адамаў рознымі грэшнымі выдумкамі, якіх змест традыцыйны, толькі ўпакоўка ўвесь час казытліва мяняецца...

У Тапарах хаты розныя — драўляныя, мураваныя, рознага дызайну. І відаць, што вёска бяднейшая; сяляне тут жывуць у прынцыпе небагата. На пальцах адной рукі можна пералічыць панадворкі, па якіх відаць, што іх гаспадары займаюцца сякой-такой сельскагаспадарчай дзейнасцю. Кароў трымаюць, бо блізка пашы і сенажаці. Пры платах на вуліцы простыя лавачкі, відаць, што людзі яшчэ выходзяць пасядзець. Пры мне людзі акурат выйшлі чакаць крамы мабільнай, бо сталай няма. І, сабраўшыся, наракаюць на вялікую разрозненасць у заробках, што шышкі, што высока сядзяць, бяруць многа, а просты чалавек нічога не мае, нават работы не мае. Часам моладзь, як з'язджаецца, то нешта арганізуе, найчасцей галосныя забавы.

Аўтакрама ўязджае ў вёску з сігналам, як на трывогу. Крамы ў Тапары заязджаюць штобудзённа. За Тапарамі, як і да Тапароў, шмат палеткаў абсаджаных кустамі парэчак. І між радкамі кустоў траўка абкошаная, відаць пра тыя парэчкі ёсць дагляд. Палеткі за Тапарамі ў бок Грабаўца ўтвараюць такую шахаўніцу: бярэзіна, хваіна, парэчкі, аблагі, пашы, ворыва, пасевы. За Тапарамі аддаленыя могілкі, на якіх шмат блакітных цэментных крыжоў старога дызайну, якіх шмат і на дубіцкіх могілках — відаць з рук аднаго майстра выйшлі яны...

У бок Грабаўца лес на від трыццацігадовы, мабыць, пасаджаны на схіле геркаўскага гаспадарчага „цуду", які цяпер так усе хваляць — хваіна, бярэзіна, нават яліна.

Першая хата Грабаўца выглядае быццам нейкі сімвал сялянскага лёсу — на месцы стадолы пажарышча. Забудова прылягала да лесу, мо той будынак хто і падпаліў. А на падворку мноства сельскагаспадарчых машын пад адкрытым небам. А на Грабавец наступае ўсё смялей маладое пакаленне прыроды. Тут бярозкі і хвоечкі ўжо смела заходзяць між крайнія хаты, ужо пачынаюць захоп Грабаўца ў лясныя абдымкі. Так, цяпер бярозкі і хвоечкі наступаюць на чалавечыя здабыткі, а калісь-калісь чалавек наступаў на лес — каля Грабаўца грабовы, каля Дубіч дубовы, каля Елянкі яловы. І высякаў яго тапарамі...

У Грабаўцы хаты акуратненькія, многа хат мураваных, і драўляныя хаты дагледжаныя. Спыняюся каля крамы пасярэдзіне вёскі, цікавяць мяне два будынкі, якіх выгляд падказвае іх ранейшую грамадскую ролю. Пытаю пра іх двух сустрэтых мужчын, якія і паведамляюць мне, што гэта былая школа і былая святліца. Школьны будынак войт некаму прадаў; сяляне наракаюць на войта, што ён надта ганарыста да іх ставіцца, прадаў школу паціху некаму звонку, калі б пра гэта паведаміў мясцовых, мо хто з іх купіў бы. А ў святліцы нічога не дзеецца, стаіць пустая, ніхто ёю не карыстаецца...

Паміж Грабаўцом і Дубічамі цераспалосіца з лесу, займаных самасеем аблагоў, ворыва. За Грабаўцом два ветракі, адзін ганарысты, з шыльдачкай пра продаж. А другі ледзь трымаецца. Ну, што ж, адмалолі сваё, а людзі сваё адсеялі і аджалі. Адпачнуць ветракі, адпачне і зямелька ад сельскагаспадарчай тэхнікі.

У Дубічах заглядаю ў парк. Там помнік — выява наступаючага байца на фоне чырвонага сцяга з такой жа чырвонай зоркай. І табліцы пра прысвячэнне яго салдатам Чырвонай Арміі, якія загінулі ў час апошняй вайны на тэрыторыі Дубіцкай гміны: загінула іх там дваццаць шасцярых вядомых і чатырыста дваццаць шасцярых невядомых. Гэтыя лікі на свой лад сведчаць пра ваеннае майстэрства савецкіх палкаводцаў і пра клопат маскоўскага кіраўніцтва пра пашану падуладнаму яму простаму савецкаму чалавеку...

Новае Ляўкова

Лічацца добрыя ўчынкі

У Новым Ляўкове (Нараўчанская гміна) вадзіцель аўтамашыны ехаў „на двух газах" і пацэліў у вялікі пластмасавы кош на смецце ды разбіў у ім дзве сценкі. З міні-кантэйнера рассыпалася смецце. Цераз дзірку ў сярэдзіну ўмяшчальніка палезлі бяздомныя сабакі і каты. Сабакі выцягнулі пакеты з кансервавымі бляшанкамі і з упакоўкамі з-пад сыркоў.

25 лістапада г.г. у цэнтры вёскі валяліся парваныя пакеты, брудныя паперы і іншая непатрэбшчына. Убачыў гэта радны з Ляўкова. Ён пайшоў да свайго брата параіцца, як „склеіць" кантэйнер. Канстанцін Целушэцкі ўзяў г.зв. пас для счэплівання дроў на фуры, абхапіў ім разбіты ўмяшчальнік, сціснуў да сябе сценку да сценкі, затым завязаў вакол кантэйнера вяроўку і папусціў пас. І ўмяшчальнік служыць як раней. А раскіданае на абочыне дарогі і ў рове смецце пазбірала спадарыня Ядвіга.

Вырашыў я напісаць у „Ніву" пра такі дзейсны падыход да справы. Так павінна быць. Гэтак жыхары Ляўкова робяць карысна самі для сябе. Яны не трывожаць абы-чым гмінных улад, бо і навошта.

(яц)

У Храбалах

Мне часта прыходзіцца праязджаць шашою Бельск-Падляшскі — Беласток і мінаць вёску Храбалы. Ужо даўно і я заўважыла, што пры шашы пабудаваны новыя прыпынкі для пасажыраў ПКСу. Яны сапраўды прыгожыя. Ранейшыя панішчылі хуліганы. Гутарыла я з солтысам вёскі і радным Юркам Хількевічам. Ён сказаў мне, што гэтыя прыпынкі паставілі за фінансавыя сродкі Бельскай гміны. Карыстаюцца імі ўсе, а менавіта жыхары навакольных вёсак: Райска, Кнаразоў, Рэпнева, Плёсак, Грыневічаў-Малых. Вядома, выгляд сведчыць аб мясцовасці. Солтыс дадаў, што ад гэтага школьнага года перастала ў Храбалах працаваць пачатковая школа. Каб будынак быў дагледжаны, спадар Хількевіч з сям'ёй пры дапамозе іншых жыхароў пільнуюць у ім парадку, прыбіраюць. Дзякуй ім за ахвярнасць і прысвечаны час, за тое, што дбаюць пра гэта як пра сваё. Калі б усе так у краіне рабілі, быў бы парадак!

Жэня Мартынюк

Спачуванні

З жалем паведамляем, што на 60 годзе жыцця пасля цяжкай хваробы адышоў у вечнасць

Васіль Іванюк

— настаўнік гайнаўскіх школ, беларускі грамадскі і самаўрадавы дзеяч, экскурсавод.

Вечная Яму памяць!

Рэдакцыя „Нівы"

Краіна зубра і фільма

Ілона Карпюк

Зубр сёння становіцца не толькі помнікам Белавежскай пушчы. Вялікую кар'еру гэтай жывёле зрабіла прамоцыя піўнага брэнда, якая, можна сказаць, дала новае жыццё піву „Зубр". Рэкламы на польскім тэлебачанні напэўна павялічылі кола аматараў не толькі самога піва, але і пушчанскага прадстаўніка парнакапытных, які становіцца ахоўнікам для іншых, мудрым, старэйшым братам, бацькам і каралём. Усё ў адным. Аказваецца, сімвал пушчы можа змясціць у сабе намнога больш асацыяцый і значэнняў.

— На чацвёрты фестываль „ŻubrOFFka" прыйшло да нас каля 260 фільмаў, — падводзіць вынікі мерапрыемства Мацей Рант з Беластоцкага асяродка культуры.

Гэта добры і нечаканы вынік. Але не ў колькасці справа, прынамсі ў галіне мастацтва, але для маладога фільмавага фестывалю, якім з'яўляецца Міжнародны фестываль кароткаметражных фільмаў „ŻubrOFFka", гэта надзея на будучыню. Тым больш, што зараз і канкурэнцыя ў галіне такіх фестываляў вялікая. Гэта хутчэй за ўсё на карысць развіццю маладых кінематаграфістаў і творцаў культуры, таму вельмі добра, што Беласток не застаецца ззаду за іншымі гарадамі. „ŻubrOFFka", побач прамоцыі зубра як сімвала Беласточчыны, мае яшчэ адно важнае вымярэнне. Праз вялікае акно культуры аглядае жыццё фільмавага мастацтва на ўсходзе Еўропы. Гэта не першая гэтага роду ініцыятыва, бо сучаснае мастацтва ўсходняй і сярэдняй Еўропы паяўляецца ў Беластоку не менш рэгулярна чым канцэрты польскіх зорак. Зразумела, у тым ліку сваё месца мае таксама беларуская культура.

Паказы фільмаў ці мерапрыемства пад мілагучнай назвай „А ты, старык, куды?", ладжаныя Беластоцкім асяродкам культуры, вядуць да пазітыўнай прывычкі сярод атрымальнікаў прапаноў культуры, што беларускае сучаснае мастацтва мае людскі твар, неаднакратна на еўрапейскім узроўні. Таму і наракаць на прысутнасць публікі зараз немагчыма. А яшчэ не так даўно здавалася, што асноўнай рысай беларускай культуры з'яўляецца Лукашэнка. Гэты падыход мяняюць цікавыя творы (прадукты), асобы і акцыі, у тым ліку, зразумела, і кіно. Ужо ў мінулым годзе беластоцкая публіка мела магчымасць пазнаёміцца з творчасцю Арцёма Лобача. Ён — малады чалавек, у якога ўяўленне працуе інтэнсіўна, а большасць фільмаў стварае на сваім камп'ютары. Яго відэа на песні беларускіх гуртоў маюць шмат прыхільнікаў і хаця ў гэты раз на фестывалі „ŻubrOFFka" Арцём застаўся без узнагароды, песня гурту „Earworm" дзесьці ў галаве круціцца з-за творчай выявы Арцёма. Асноўнае, што такія маладыя людзі не стаяць у месцы. З прасторы аматарскага ці незалежнага кіно Арцём загрукаў у дзверы прафесійнай дзейнасці і вельмі хутка да сваёй новай ініцыятывы прыцягнулі яго Андрэй Кудзіненка і Артур Клінаў.

— Дзякуючы Андрэю і Артуру вучуся шмат, — прызнае Арцём, — але неспадзявана вучуся і беларускай мове. Гэта сорам, што не гавару на беларускай мове, але чалавеку, выхаваным на рускай мове, гэта звычайна цяжка і ненатуральна.

Новы фільм Андрэя Кудзіненкі, як падкрэслівае Арцём Лобач, гэта іранічная і трагікамічная аповесць з вельмі выразна адзначаным гістарычным кантэкстам, якая дзеецца ў XIX стагоддзі. „Масакра", бо такі мае загаловак, найчасцей акрэсліваецца як жахлівік, але паводле майго суразмоўцы гэта проста фільм-страшылка.

На сёлетнюю „Зуброўку" прыйшло толькі пяць фільмаў з Беларусі.

— Хіба нас яшчэ там не паважаюць, — смяецца Мацей Рант, аўтар фестывалю.

Можа не паважаюць, можа не ведаюць, а можа і няма чаго пасылаць. Праўда, што ў канкурэнцыю з фільмам, які сёлета перамог у рамках фестывальнага прагляду „Акно на ўсход", цяжка ставаць, бо расійская „Бездань" павінна апынуцца хутчэй за ўсё сярод прафесіянальных, а не аматарскіх фільмаў. Але з гэтых пяці беларускіх кандыдатаў, абсалютна без ніякага сораму, вылучэнне ўзяў фільм Ігара Асмалоўскага „Правінцыял". Добрыя здымкі, прыгожыя колеры і лёгкая гісторыя. Іронія на беларускую правінцыю з пачуццём гумару, якое спадабалася беластоцкай публіцы. Ёсць трактары, свінні, вясковыя каханні і амбіцыі, ёсць таксама камп'ютар і бутэлька „Ballantines". Не так дрэнна як пра Беларусь гаворыцца, хаця не так далёка ад паўсюль вядомых стэрэатыпаў. Стэрэатыпы аднак не бяруцца з нічога, а кіно якраз можа імі карыстацца таксама і ў пазітыўным сэнсе.

Грамадзянская платформа штурмуе вёскі

Грамадзянская платформа рашыла прыцягнуць выбаршчыкаў на вёсках. Дзеля таго парламентарыі атрымалі задачу арганізаваць сходы ў сваім асяродзі і прэзентаваць праграму партыі.

Сустрэча з дэпутатам Сейма Робертам Тышкевічам з Беластока адбылася 22 лістапада ў ГОК у Чаромсе. Арганізавалася яна для жыхароў Чаромхаўскай і Кляшчэлеўскай гмін. Паведамленні-запрашэнні былі раней разасланы салтысам, а мясцовыя самаўрады былі абавязаны задбаць аб прысутнасць насельніцтва. Сустрэча пачалася а першай гадзіне пасля абеду пры нешматлікай публіцы. Пакуль да афіцыйнай часткі, арганізатары ўручылі прысутным рэкламныя пакеты з падарункамі (шарыкавая ручка, насценны каляндар, тры экземпляры часопіса „Голас ГП", бірулька для ключоў і лістоўка Грамадзянскай платформы на тэму праграмы „Развіццё вясковай прасторы"). У зале сабралася больш за шэсцьдзесят чалавек, прытым значную частку склалі гмінныя чыноўнікі з войтам Міхалам Врублеўскім і бурмістрам Кляшчэляў Аляксандрам Сяліцкім на чале. Прысутных прывітаў прадстаўнік павятовай структуры ГП, які ў некалькіх словах сказаў аб мэце сустрэчы, затым перадаў голас Роберту Тышкевічу. Прамоўца не займаў многа часу. Пакарыстаўся данымі з лістоўкі, якую атрымалі ўдзельнікі сходу. Гаварылася у ёй аб праграме развіцця вясковых абшараў і задачах па яе рэалізацыі, а таксама аб дапамозе Еўрасаюза для сельскагаспадарчага сектара. Завяршаючы выступленне прамоўца заахвочваў прысутных да дыскусіі.

Пачаў войт Міхал Врублеўскі з праблемы абмежаванага карыстання са структурнай праграмы „Супольнасці".

— Чаромхоўская гміна ў гэтых адносінах займае апошняе месца ў краіне, а гэта таму, што заяў многа і не ўсіх прасіцеляў можна задаволіць, — канстатаваў войт.

На маю думку трэба пахадайнічаць за прадаўжэнне праграмы (абавязвае 3 гады), бо яна дае шанц на рэалізацыю шматлікіх інвестыцый у сферы лакальнай інфраструктуры. Чарговай праблемай была разбудова пагранперахода Полаўцы — Пяшчатка.

— Мне вядома, — прадаўжаў кіраўнік самаўрада, — што ўлады намерваюцца ў наступным годзе абмежаваць сродкі на гэтую мэту. Абазначала б гэта прытармажэнне інвестыцыі. А чарамшанам залежыць, каб яна закончылася чым хутчэй, бо ад таго залежыць развіццё чаромхаўскага асяроддзя.

Яшчэ дзве справы крануў войт. Першая тычылася прамога чыгуначнага сполучэння Гайнаўка — Варшава (войт прасіў парламентарыя пахадайнічаць перад Маршалкоўскай управай, каб гэтую лінію пераняла Мазавецкая чыгунка, а нават і далейшы яе адрэзак — па Семяноўку). Апошняй справай было пашырэнне дарогі Кляшчэлі — Гайнаўка.

— Пяць гадоў таму афармілі дакументацыю на пашырэнне дарогі да Елянкі. Так і засталося. Трэба адзначыць, — аргументаваў войт, — што дарога ў Гайнаўку надта вузкая і стварае вялікую пагрозу аварыі пры абмінанні аўтамабіляў, асабліва грузавых.

Парламентарый не даў станоўчых адказаў адно паабяцаў перадаць прад'яўленыя праблемы кампетэнтным органам.

Яшчэ двое ўдзельнікаў узяло голас у дыскусіі. Старшыня Таварыства „Прыязны транспарт" Надзея Суліма прасіла вярнуць адменены цягнік Беласток — Чаромха ў 20:30, а Аляксандр Тычына крануў праблему адкрыцця Фітасанітарнага інспектарата ў Семяноўцы. Без фітасанітарнага нагляду перавозчыкі, якія маюць займацца транспартам драўніны, не змогуць наладзіць супрацоўніцтва з замежнымі ўсходнімі партнёрамі. А такую магчымасць стварае пабудова завода „Ікея".

Гэта асноўныя справы, якія чарамшане прад'явілі прадстаўніку Грамадзянскай платформы на сустрэчы ў Чаромсе.

Уладзімір Сідарук

Як Толік сушыў зямлю

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Зямля, усё ж, адпомсціла Толіку з Дубна. Дакладна пад Сакалдой. Вывалакалі экскаватар. Магутны лом выпырснуў як палачка з-пад заматанага сталёвага троса і прабіў Коліку чэрап. А на беразе рова, які меў надаць новы цёк рацэ, было іх больш: рабочых і назіральнікаў у касцюмах, спецыялістаў па меліярацыі.

— Праца — працай. Я пачуваў сябе да свайго абавязку. За мяне яе ніхто не выканае.

На Сакалдзе, у 1990 годзе, будавалі якуюсь застаўку. Гэта не было ані з РМПу, ані з „Вадролю", толькі экскаватар ад нас узялі. Капалі абводны канал, каб старое рэчышча засыпаць. А новым вада мела паплысці. Землечарпалку сцягнула ў новае рэчышча. Яшчэ з дзесяць метраў засталося пакапаць, каб вада пайшла тудою. І нырнула землечарпалка ў тое новае рэчышча! Прывёў я экскаватар-„сталінец". Сталінец буксуе, не дае рады выцягнуць. Падчапіў я трос на падвойню лябёдку. Зачапіў яе за сталінца — бо што ж ён 15 тон толькі важыў. „Сталінца" яшчэ больш у зямлю ўціснула, аж задок уверх выперла. Але адсмактала. Землечарпалка пачала памаленьку вылазіць на скарпу. Ужо-ўжо амаль наверсе была, але чую, што штосьці цяжэй ідзе. На адным з блочкаў трос быў прыкладзены, сталёвы, тоўсты як рука (на другім быў у падкоўку) — і пры землечарпалцы трос лопнуў, адбіўся аб тыльні борт КрАЗа — і ў мяне. Пайшло каля вока. Прабіла шчаку, нос, лоб. Толькі чорная яма, спечаная кроў. Сцебанула мяне яшчэ гэтым ломам у бядро. Прывезлі мяне ў шпіталь Снядэцкага на ларынгалогію, пасля на акулістыку. Бачу. Вока ніжэй, відаць, асаджана, але бачу! Калі б не старанне лекараў, выглядаў бы як карыкатура!

Толік цяпер мае ўгнёны чэрап, але памілавала яго неяк тая зямля, не захацела забраць адразу. Пакінула яго яшчэ на пакуты. Цяпер ён бяздомны, як тыя звяры і птушкі, якім высушыў дом.

— Можна сказаць, што я тут усё асушыў, — кажа Толік, цяпер пенсіянер. Звольнілі яго з працы пасля тае страшнае прыгоды. — І перш за ўсё асушыў і заліў „Семяноўку". Магу пералічыць усе вёскі ў ваколіцы: і тыя затопленыя, і навакольныя. Людзей памятаю. Цяпер там крыху інакш, бо асфальт пакладзены. А тады мы ездзілі на сваіх магутных машынах па жвіроўках, аж зямля гнулася. Я першы экскаватар-спіхач туды завёз 22 верасня 1976 года. Яшчэ вёска Лука была. Лука доўгая была, больш за 140 гаспадароў там жыло. Памятаю Каральчукоў, Барташукоў... 22 верасня 1976 г. завёз я ў Семяноўку Андрэя Салаўя. Святой ужо памяці. Жыў ён на Свабоднай у Беластоку. Пасля Гэнька Сянкевіча. Пасля вазіў абсталяванне. Машыны. Высялялі вёскі — Рудню, Луку, Гарбары, Буды... Мая сяброўка жыла ў Будах. Яе бацькі купілі ёй кватэру на Пулковай у Беластоку. Я на Семяноўцы, на „залеве" ад 1992 года не быў. Залілі, пасля тыя багны пайшлі ўверх... Спусцілі ваду, сталі выцягваць тыя пні, нанова ачышчаць... У 1992 годзе мала было той вады. Калі мы толькі пачыналі заліваць, птаства воднае разведала, паявіліся чайкі...

Меліярацыяй Толік заняўся адразу пасля войска. Да 1990 года, да тае помсты. Спачатку — да 1982 года на моцным *спшэнце*, КМ-251, пасля на экскаватары-землечарпалцы, ад чэрвеня 1975 г. У 1970 годзе ездзіў на „татры" з сябрам. Экскаватары — Т75. Сталінец — 100, 130. 404, 406. 608. Агарамадныя капары!

Як было спачатку? Якая была тая зямля, якую выварочваў навыварат?

— Зямля была багонная. Спачатку капалі мы равы. Калі былі зараслі, дык трэба было выкарчаваць. Рабіліся таксама гэтак званыя бакавыя равы. Пасля наступала дрэнажаванне: закладваліся керамічныя трубкі — „пяцёркі", „дзесяткі", адна была збірак, другая — адсочнік. Часам была тэрыторыя падмоклая, але калі быў спад, бывала, што і праз пагоркі трэба было пераходзіць. Вядома, на тых багнішчах людзей не вельмі шмат было, але птаства, андатраў!.. Харошыя андатры плавалі ў сямідзесятыя гады... Мае першыя крокі ў меліярацыі гэта тут, на Каменцы пад Заблудавам. Каменка была зарослая. Плыў маленькі струмень, а наўкола карчы, зелле. Было многа баброў, асабліва ў Нятупе пад Крынкамі. Перакапаем рэчку, а бабры нам тое за ноч заваляць! Дык мы тыя іхнія запоры зноў згартаем. Больш чым за Крынкамі баброў мы не бачылі.

Пасля тае аварыі, Колік ездзіў прыватна. Працаваў у транспартнай фірме, у ПССе.

— Там таксама добра пажыў. Вазіў масла, сыры, малако, алеі... Завожу, правяраю — у адным магазіне замала, ды нічога не кажуць, а ў другім — замнога: спецыяльна рабілі, ці я не палакомлюся. Я адразу — тэлефон. Прыязджаю: „Пане Толік, вырабіў пан марку". Кіраўнічкі задаволеныя, кажуць: „Калі б гэта быў ПССаўскі шафёр, дык тое што зашмат было — пайшло б „налева", а таго, чаго не хапала — дык не хапала б". Два і паўгода вазіў я тавар, ой, добра з імі пажыў. У „Далікатэсах" да гэтай пары мяне памятаюць. На мясны зайду: „Чаго хочаш, Толік?" — „Можа чагось лепшага. Шынкі каб сапраўды добрай". Табе здаецца, што цяпер з гэтым праблемы няма? Не на 80 працэнтаў вада каб была ў мясным вырабе, а мяса! Дык яны — на заплечча. Вось сёння мы бралі бачок у „АБЦ". Дзяўчына раней працавала ў „сямёрцы" на Звежынецкай. Дык яна мне якраз такога бачку адкроіла. Бачыш — сумленнасць заўсёды аплачваецца.

— Я ў Буяўцы лавіла печкуроў кошыкам. Буяўка, прыток Нарвы, у той час была ўжо ровам. А ці табе гэтая праца давала задавальненне?

— Калі я пачаў на Каменцы, памочнікам, я хацеў адразу вадзіцелем быць, дык кажуць, паспееш, зробіш курсы, працуй адразу. Пакуль не ажаніўся са сваёй графіняй, працаваў на найцяжэйшых машынах. Ёй не спадабалася, што чорнарабочы, увесь час замуляны. Прыязджаў на суботу і нядзелю дахаты толькі. Мая графіня працавала на ткальні ў Фастах, грашакі зарабляла. Выслала мяне за мяжу. Я хату запісаў на жонку — за мяжой усё ж можа мне здарыцца, дык нашто маюць потым мець клопаты. Трапіў у „Рэйх", у 2002 годзе, 40 кіламетраў за Мюнхенам, на працу ў стадніну коней. Юргель, уласнік, родам быў з Сілезіі, атрымаў быў спадчыну ў Нямеччыне, дык туды перасяліўся. Крыху ўжо забыў польскую мову, але гаварыў. У яго было пару памочнікаў з Польшчы, але неяк упадабаў мяне, кажа: ты з Падляшша, відаць адразу — такі людскі чалавек. Юргель гадаваў коней для гонак, кахаў жывёлу. Юргелеў сын — большая фігура ў Мюнхене, казаў, нашто яму тыя бацькавыя коні. Але Юргель быў прыхварэў. Пабыў тры тыдні ў бальніцы, а сын прыехаў, прадаў найлепшых коней-чэмпіёнаў. Дык той Юргель да мяне як да сына: „Толік, ты разумееш звяроў, не б'еш іх, чуеш іх, застанься са мною да канца жыцця, дык табе перапішу трэцюю частку стадніны". Ну, буду там невядома кім! А ў мяне справы дома. Кажу Юргелю: „Што мне рабіць з хатай у Беластоку? Трэба паехаць, завезці большыя грошы, могуць цяпер у Польшчы яе выкупіць, 83 метры".

Завёз быў Толіка Юргель да натарыуса, усё аформілі, як трэба, што жонка можа раз узяць з яго валютнага замежнага рахунку шэсць тысяч злотых. Каб яго не ашукалі, усяго Юргель дапільнаваў. Жонка ў Беластоку атрымала нямецкі завераны ліст, перакладчык пераклаў, каб узяла раз у банку Міленіюм грошы і выкупіла хату.

— Прыязджаю я ў верасні, прывалакаю дадому дзве торбы. Адзін ключлучнік — не пасуе. Другі — таксама. Я на званок — а тут дачка пачула, што я скрабуся. „О, тата, а каму ты гэтыя торбы цягнеш?" — „Як — каму? Табе, маці, Пецю, Андрэйку... Унучкам Анэтцы, Паўлінцы... Трэба ж..." — „Дык ты тут ужо не жывеш. Цябе маці выпісала з хаты. І на развод падала". — „Дык я цяпер без прапіскі?" — „Маці паведаміла загс, што ты прапаў без весці. Не пражываеш тут, дык цябе выкраслілі з месца пражывання. Да таго маці з жыватом хадзіла з фастаўскім калегам. І ты ёй гасцінцы вязеш? Можаш сказаць ёй у вочы, што гэта ведаеш ад мяне. Я чатыры разы ад яе выходзіла з хаты, ужо сцярпець не магла, што яна вырабляла! Сама чула, як з гэтым сваім каханкам пра аборцыю гаварыла, што грошы ёй патрэбны, а пасля ў Бельск ездзіла да лекара. Пакінь тое што нам тут, а рэшту праз балкон выкінь, хай людзі бяруць. Едзь у банк, правер колькі ў цябе грошай засталося"! Паехаў я ў банк „Міленіюм" — там толькі мая пенсія за тры месяцы. Я ў іншы на Юравецкую — а там з васьмі з паловай тысяч марак — толькі сем з паловай маркі засталося.

Толік не вярнуўся да свайго нямецкага сябры — не мае актуальнага пашпарта. Пашпарта не можа зрабіць, паколькі не мае прапіскі. Жыве цяпер у прытулку для бяздомных па вуліцы Васількоўскай у Беластоку.

Памяць герояў Случчыны ўшанавалі беларусы ЗША

28 лістапада на беларускіх могілках у Іст-Брансвіку, штат Нью-Джэрсі, ля помніка змагарам за свабодную Беларусь адбылася паніхіда, а пасля ў беларускай царкве ў Гайлэнд Парку прайшлі мерапрыемствы з нагоды Слуцкага паўстання.

Да помніка героям Слуцкага паўстання былі ўскладзены вянок ды жывыя кветкі. Над галовамі прыйшоўшых узгадаць беларускіх патрыётаў і ўшанаваць іх памяць луналі бел-чырвона-белыя нацыянальныя сцягі, з якімі за ўтварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1920 годзе змагаліся супраць бальшавіцкай арміі беларускія патрыёты.

Паніхіду адправілі епіскап Навагрудскі і Паўночнаамерыканскі Святаслаў і пратаіерэй а. Зіновій.

У гэты ж дзень крыху пазней у грамадскай зале царквы св. Іконы Жыровіцкае Божае Маці ў Гайлэнд Парку працягнуліся мерапрыемствы з нагоды Слуцкага збройнага чыну.

Беларускі музей у Нью-Йорку адкрыў выставу „Мастацтва супраць дыктатуры". Быў зачытаны зварот ад старшыні Беларускай Народнай Рэспублікі Івонкі Сурвілы. Пра беларускіх змагароў розных часоў казалі старшыня Нью-Джэрсійскага аддзела Беларуска-Амерыканскага задзіночання Юрка Азарка і беларускі мастак Алесь Шатэрнік.

Фільм „Слуцкі збройны чын" з цыкла „Невядомая Беларусь", зроблены тэлекампаніяй „Белсат", працягнуў адкрываць невядомыя дагэтуль старонкі беларускай гісторыі часоў змагання з саветамі і іх чырвонай навалай. У савецкія часы падзеі Слуцкага збройнага чыну не вывучаліся ў школе, пра іх не расказвалі падручнікі гісторыі, не гаварылі медыі. Абыходзяць стараной тыя падзеі ў нашых школах і сёння, не абмяркоўваюць гэтую тэму дзяржаўныя СМІ...

Шмат хто з герояў тых падзей быў асуджаны савецкай уладай, высланы ў Сібір і ўжо ніколі не вярнуўся на Радзіму. Цяперашняя ўлада нашай краіны і суды адмаўляюцца рэабілітаваць людзей, якія былі прызнаны ў тыя часы ворагамі народа за тое, што баранілі свой край — нашу родную Беларусь. Ужо адзін толькі гэты факт цудоўна сведчыць пра тое, наколькі антыбеларускай з'яўляецца сённяшняя ўлада краіны.

Жаданне мець сапраўды беларускую ўладу — тую, якая будзе дбаць пра Бацькаўшчыну, яе культуру і ўвесь беларускі народ, памятаць гісторыю свайго краю — гэта тое, што аб'ядноўвае беларусаў, якія жывуць сёння з беларусамі часоў Слуцкага збройнага чыну.

Мерапрыемствы па ўшанаванні Слуцкага збройнага чыну былі арганізаваны Нью-Джэрсійскім аддзелам БАЗА.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

26 лістапада 2009 года бельская „тройка” гасціла ў сябе будучых першакласнікаў і іх бацькоў.

Дырэктар школы спадар Васіль Ляшчынскі сардэчна прывітаў сабраных. Госці аглядалі школу і пабачылі мультымедыйны паказ аб школе.

Мерапрыемства ўзбагаціла цікавая мастацкая частка ў выкананні вучняў пачатковай школы і гімназіі, між іншым, тэатральных груп і вакальна- танцавальных ансамбляў „Жэўжыкі”, „Вянок”, „Світанак”, „Світаначак”, „Капрыс”.

Шасцігодкі з вялікім зацікаўленнем аглядалі выстаўку мастацкіх прац вучняў, а іх бацькі пазнаёміліся з дасягненнямі вучняў „тройкі” ў многіх конкурсах , не толькі на ўзроўні раёна, але таксама ваяводства, а нават краіны.

На канец сустрэчы будучыя вучні атрымалі маленькія, але прыемныя падарункі.

Бельская ПШ № 3 запрашае ў свае парогі

Група „Жэўжыкі” з абрадам пра лён

Выступае група „Вянок”

Экскурсія ў Беларусь

Дарагая „Зорка”!

Я вучаніца III „б” класа Публічнай гімназіі ў Дубінах. Хачу падзяліцца з вамі ўражаннямі ад нашай школьнай экскурсіі ў Беларусь.

Наша школа прымала ўдзел у конкурсе „Пазнай Беларусь”, арганізаваным беластоцкім Культурным цэнтрам Беларусі пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Польшчы. Многія вучні атрымалі вылучэнні ў гэтым конкурсе. Наша школа была запрошана на ўрачыстае завяршэнне конкурсу ў Падляшскую філармонію на ўрачысты канцэрт і падвядзенне вынікаў. Наступным этапам была экскурсія для трыццаці вучняў нашай школы ў Беларусь.

У суботу 7 лістапада 2009 г. мы сабраліся пад школай у 8.15. Потым паехалі ў бок Белавежы. У Грудках перайшлі мяжу. Першым этапам нашага падарожжа быў запаведнік. У ім мы пабачылі зуброў, ваўкоў, мядзведзяў, ласёў, соў. Потым мы пайшлі ў прыродазнаўчы музей. Там таксама паглядзелі звяроў, якія жывуць у Белавежскай пушчы. Пасля пайшлі паглядзець Белую вежу ў Камянцы, пабудаваную ў трынаццатым стагоддзі. Адтуль мы паехалі ў рэстаран на абед. Наведалі і магазіны ў Каменюках ды шмат чаго там сабе купілі. Якім прыемным атракцыёнам быў для нас візіт у сядзібе Дзеда Мароза! Мы размаўлялі з Дзедам Марозам, смяяліся, рабілі фотаздымкі. Мне больш за ўсё спадабалася асвятленне.

Калі мы вярталіся дахаты, на мяжы нас правяралі мытнікі. Надвор’е было брыдкае, дождж ішоў увесь дзень, ды мы, задаволеныя, шчасліва вярнуліся дахаты.

Агнешка ПРАКАПЮК,
Дубічы-Асочныя

Выступаюць вучні з класа 3 „б”

Беларуская народная казка

Баран бок абадран

Быў раз дзед, а ў таго дзеда баран. І захацеў той дзед зарэзаць свайго барана. Толькі пачаў рэзаць, трошкі бок абадраў, а баран усхапіўся ды ўцёк і схаваўся ў лісіную норку.

Прыйшла ліса ў норку, ажно там нехта сядзіць. Спужалася лісіца і пытаецца:

— Хто там?

А баран ёй адказвае:

— Я баран, бок абадран, чатыры нагі, два рагі, — як дам рагамі, дык ты паляціш дагары нагамі!

Лісіца спужалася і пабегла ваўка прасіць.

— А воўчанька ты мой, а кумочак мой, — хадзі, памажы маёй бядзе, паглядзі, хто гэта ў мяне ў норцы сядзіць.

Паслухаў воўк лісу, пайшоў з ёю ў нару выганяць барана. Прыйшоў, ды сам, сам — носам нюхае.

— Хто там?

— Я баран, бок абадран, чатыры нагі, два рагі, — як дам рагамі, дык ты паляціш дагары нагамі!

Воўк спужаўся ды ўцёк. Пайшлі яны з лісіцай ды к мядзведзю, пачалі мядзведзя прасіць:

— Мядзведзінька, бацечка, — хадзі, памажы нашай бядзе, паглядзі, хто гэта ў лісінай норцы сядзіць.

Паслухаў мядзведзь, пайшоў з імі да норкі, прыйшоў ды пытаецца:

— А хто там?

А баран яму:

— Я баран, бок абадран, чатыры нагі, два рагі, — як дам рагамі, дык ты паляціш дагары нагамі!

Мядзведзь спужаўся ды ўцёк. Ідуць яны, ідуць каля саду, ды бачаць — ляціць пчолка. Давай яны гэтую пчолку прасіць.

— Пчолка, душачка, — хадзі, паглядзі, хто гэта ў лісінай норцы сядзіць.

Паляцела пчолка з імі, прыляцела і пытаецца:

— А хто там?

— Я баран, бок абадран, чатыры нагі, два рагі, — як дам рагамі, дык ты паляціш дагары нагамі!

А пчолка не спужалася — у норку, ды давай кусаць барана за абадраны бок.

Баран спалохаўся, выскачыў з норкі ды давай уцякаць.

Галерэя Зоркі

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

1. Імя і прозвішча:
Мартына Янкоўская
2. Твой любімы прадмет: беларуская мова і фізкультура.
3. У жыцці хачу стаць: настаўніцай.
4. У сяброў цаню: вернасць, калі гавораць праўду.
5. Не люблю: сваркі, зайздрасці і самалюбства.
6. Па-беларуску размаўляю: з бабуляй і дзядулем, з бацькамі часта размаўляем па-свойму.
7. Кніжка, якая мяне захапіла: „Пінокіё" , „Дзеці з Бюлербю".
8. Падабаецца мне музыка: гіп-гоп.
9. Люблю размаўляць з: сябрамі і бацькамі.
10. У „Зорцы" падабаецца мне: крыжаванка.
11. Чаму: бо можна выйграць узнагароду.

Царскі гасцінец



Дагэтуль падчас нашых падляшскіх вандровак засяроджваліся мы на канкрэтных мясцовасцях, вёсках ды гістарычных месцах. Гэтым разам вашай увазе прапаную не адно канкрэтнае месца, яле абшар або, лепш сказаць, дарогу. Маю тут на увазе гэтак званы Царскі гасцінец.

На працягу значнай часткі сваёй гісторыі Бельск-Падляшскі і яго ваколіцы знаходзіліся на шляху многіх важных дарог ды трактаў. Дастаткова нагадаць пралягаючы цераз Бельск каралеўскі тракт-дарогу, якая спалучала Вільню з Кракавам, як жа істотную ў часы польска-літоўскай уніі.

Не менш важным быў г.зв. Царскі гасцінец — дарога, якою цераз Бельск у Белавежу падарожнічалі расійскія цары, князі, арыстакраты. Хаця гасцінец існаваў тут раней, у XIX стагоддзі яго ўдасканалілі і ён набыў проста стратэгічнае значэнне.

Першапачаткова дарога пралягала цераз Відава, Агароднікі, Ужыкі і, мінаючы Крывую і Локніцу, накіроўвалася, між іншым, праз Ракавічы ў пушчу. У час праездаў імператара жыхары навакольных вёсак былі абавязаны суправаджаць світу. Па загадзе вядучага світу яны запальвалі падрыхтаваныя раней паходні.

У народнай памяці па сённяшні дзень захаваліся шматлікія ўспаміны і легенды, звязаныя з праездам цара цераз паасобныя вёскі. Неаднакратна гэта проста байкі, у іншых выпадках — расказы пацверджаныя дакументамі і гістарычнымі фактамі.

Напрыклад, у Відаве жыхары ўспамінаюць, што сапраўды цераз іхняе сяло праязджаў цар і што на яго прыезд уся вёска мусіла быць як след упарадкаваная. Адна з менш праўдападобных звестак такая, што быццам нейкая жыхарака Відава гуляла з царскімі дзецьмі.

У іншых вёсках у ваколіцах Царскага гасцінца можам пачуць гісторыі, што іхнія жыхары, паколькі не маглі звяртацца непасрэдна, свае просьбы да імператара пісалі на галовах, спадзеючыся, што цар іх прачытае.

Трэба таксама ведаць, што падарожныя, едучы ў Белавежу, не заўсёды выбіралі тую самую дарогу. Варта прыгадаць, што ў свядомасці жыхароў гэтых беларускіх зямель Гасцінец захаваўся не толькі як адна канкрэтная дарога, але і як абшар, распаложаны вакол гэтай жа дарогі.

На жаль, не ўсе фрагменты даўняга Царскага гасцінца захаваліся па сённяшні дзень. Частка з іх зусім непраходная, на іншых распаложаны палі.

Міхась СЦЕПАНЮК

Музыка з кайфам

Паважаны слухач!..

...усё дзеля Цябе! — маглі б адказаць сябры гурту „IQ48" і думаю, у душы так і адчуваюць. А фанаты такіх музыкаў паважаюць і кахаюць, бо як не любіць гэтых „Здаровых Ласей", што кожны раз з сімпатыяй запрашаюць да супольнай гульні, з сімпатыяй прэзентуюць чарговыя песні і з той жа самай, а нават большай сімпатыяй перадаюць да спампавання ў інтэрнэце свой новы альбом, бясплатна!

„Акустыка IQ48 "гэта, як самі музыкі прызналі, эксперымент. Да канца не маглі ведаць як атрымаецца іх характэрная і спецыфічная музыка ў такім варыянце. У іх жа шмат такога... „фрыстайла" (які толькі мы адчуваем, бо часцей за ўсё ў музыкаў усё перадумана). Недахопы гукаў у „IQ48" запаўняў заўсёды саксафон, але з вясны ў гурце саксафаніста ўжо няма. Дарогі разышліся, а „айкюшнікі" не шукалі замены. У гітарным саставе прыступілі да рэалізацыі новай ідэі. З кастрычніка можна ўжо гэты рэліз з сайта гурту сабе проста ўзяць, але гукавы запіс гэта не ўсё. У час працы над альбомам увесь час прысутная была камера, нават не адна, таму можна глядзець і варыянты відэа на знятыя песні. Па інтэрнэце кружаць таксама кароценькія заяўкі альбома ці песень, якія запісалі лідары гурту — „Эс" і „Буззa". А што з самім матэрыялам? Ёсць. Можа гэта не самы ідэальны запіс, можа мне асабіста бракуе ўпрыгожанняў у якасці згаданага раней саксафона, але асноўнае, што музыкі зрабілі нешта для сябе і для сваіх фанатаў адначасова. „Акустыка" не мае ніякага следу камерцыі, таму хутчэй можам палічыць гэта проста гульнёй з уласнымі формамі. Даўно ўжо ходзяць чуткі, што гурт спасціг творчы крызіс і „Акустыка" мае быць спосабам на гэтую праблему. Але можа гэта толькі маленькі крызісок і неўзабаве пачуем чарговыя, захапляльныя кампазіцыі.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 50

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 36:

Гусь, клясэр, мама, угадчык, рамка, на, градка, грушка, гукач. Рамка, народы, на, акт, густ, грам, румб, мурашка, загадка, мамка, кладка, Лі, гара, ясны, гурок, стук, кошт, расказчык.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі **Наталля Тарасюк, Івона Анішчык, Агнешка Хадак, Моніка Сакалоўская** з Дубін, **Ніка Юрчук** з Бельска-Падляшскага, **Юстына Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



У віртуальным кантакце

Наступілі доўгія восеньска- зімовыя вечары. За акном холад, цемра ўжо з 16-й гадзіны, падае дождж або снег і няма ахвоты выходзіць на горад. Адны тужаць па леце, іншыя сустракаюцца на вечарынках, а яшчэ іншыя проста любяць гэты час правесці ў хатнім зацішшы з любімай музыкай або кніжкай.

Я за апошнія гады заўважыў, што шмат моладзі і дарослых праводзяць восеньскія вечары пры камп'ютары на любімых сайтах або тэматычных форумах. Зараз кожны гурт мае свой сайт, свой форум, дзе можна прачытаць навіны ад гурту або паглядзець навейшыя відэакліпы ці праслухаць новыя песні. І так людзі на форумах яднаюцца ў суполкі, часта паміж сабою сябруюць ці заводзяць дыскусіі.

Але зараз форумы не з'яўляюцца самымі папулярнымі сайтамі ў інтэрнэце. Прыйшла пара на грамадскія парталы. Гэта парталы з асноўнай рэлігійнай, культурнай або музычнай тэматыкай. Зараз у Польшчы перажывае росквіт партал nasza-klasa.pl. На гэтым партале можна сустрэць сваіх сяброўак і сяброў часоў пачатковай, сярэдняй або вышэйшай школы, дадаць іх да ліку сяброў, паглядзець іх навейшыя здымкі, даваць каментарыі. Многія гэтым сайтам карыстаюцца часцей, чым інтэрнэтным камунікатарам, каб мець сталы кантакт з каханай асобай, сустрэцца з сяброўкай або сябрам, якога доўга не бачылася.

Самым папулярным у свеце з'яўляецца Facebook, на якім зарэгістраваных некалькі соцень мільёнаў карыстальнікаў. На гэтым сайце людзі не толькі знаёмяцца, але і шукаюць працу, напрыклад, мой сябра, які часта ездзіць за мяжу. У Расеі і ўсіх краінах СНД самым папулярным сайтам з'яўляецца vkontakte.ru — адпаведнік польскіх grono.net або nasza-klasa.pl, на якіх зарэгістравана больш за 50 мільёнаў карыстальнікаў. Тут яднаюцца людзі ў тэматычныя суполкі або самі ствараюць тэматычныя форумы пра музыку, культуру, мастацтва, засноўваюць віртуальныя фан-клубы беларускіх, расейскіх ці ўкраінскіх музычных груп. Там яны змяшчаюць плейлісты для праслухвання любімай музыкі або прагледжвання кліпаў ці канцэртаў любімых груп. Часта людзі там знаёмяцца. Штораз больш рэгіструецца людзей з заходняй Еўропы, у тым ліку і Польшчы.

Ёсць таксама добрыя бакі гэтых сайтаў. Я, дзякуючы vkontakte.ru, трымаю сталы кантакт з маім сябрам, з якім вучыліся мы разам ва ўніверсітэце, а зараз пражываем не толькі ў іншых гарадах, але краінах. Партал nasza-klasa інфармуе мяне, што новага ў маіх сяброў, а старонка vkontakte.ru знаходзіць беларусаў з усяго свету.

Юрка БУЙНЮК

З любові да беларускай песні

Фота Аляксея МАРОЗА

*Размова з **Міколам Мяжэнным**, шматгадовым дырыжорам і акампаніятарам беларускіх калектываў на Беласточчыне, а адначасна выкладчыкам у Коледжы мастацтваў у Гродне.*

— Сёння (27 лістапада) Вы разам з беларускімі калектывамі з Польшчы, ляўкоўскімі „Цаглінкамі", гайнаўскім „Рэхам пушчы" і іншымі сябрамі з Беласточчыны святкуеце ў Гайнаўскім доме культуры свой юбілей 60-годдзя з дня нараджэння. Раскажыце, як Вы трапілі на Бельшчыну і Гайнаўшчыну?

— Было гэта вельмі даўно, 26 жніўня 1992 года. Мы, тры асобы з Гродзеншчыны, па просьбе БГКТ і ўлад Беластоцкага ваяводства былі напраўлены Фондам культуры Гродзенскага аблавыканкама на Беласточчыну. Славамір Пакумейка, які ўжо не жыве, затрымаўся ў Ляўкове, Уладзімір паехаў у Дашы, а я трапіў у Краснае Сяло, да калектыву „Красуні". Пасля года работы па розных прычынах двух дырыжораў не прыжылося тут, а я астаўся працаваць надалей. Можа год перад намі прыбыў у Орлю Мікола Фадзін, які працуе з „Арлянамі" і „Васілёчкамі" па сённяшні дзень. Калі „Цаглінкі" асталіся без дырыжора, Валянціна Грыка з Ляўкова звярнулася з просьбай да Валянціны Марціновіч з Краснага Сяла, каб дазволіла мне дапамагчы падрыхтавацца ляўкоўскаму калектыву да агляду „Беларуская песня". Я тады якраз прыдбаў машыну і стаў працаваць з двума калектывамі. Можа з год так ездзіў з Ляўкова ў Краснае Сяло, а калі „Красуні" перайшлі на аўтэнтычны фальклор, я стаў працаваць ужо толькі з „Цаглінкамі".

— Як у Вас атрымлівалася супрацоўніцтва з „Цаглінкамі"?

— Калектыў гэты быў цудоўны і людзі ў ім зычлівыя. Я ж, пачынаючы з 1993 года, працую з „Цаглінкамі" па сённяшні дзень. Спачатку Валянціна Грыка дбала, каб малодшыя прыходзілі ў калектыў, а калі яна пераехала ў Беласток, я і сам пачаў пераконваць маладых, каб спявалі з намі. Аднак работа з калектывам, у якім спяваюць прадстаўнікі розных пакаленняў, цяжкая. Маладыя крыху слабей спяваюць, бо ў іх няма яшчэ такога спявачага навыку, як у старэйшых людзей, што вучыліся спяванню натуральна, у маладосці. Наогул самая вялікая небяспека ў такіх мяшаных калектывах, што старэйшыя спевакі могуць з зайздрасцю глядзець на маладых. Каб не пакрыўдзілася моладзь, трэба працаваць з імі вельмі ўмела і далікатна. Аднак у ляўкоўскім калектыве ўдала наладжваецца супрацоўніцтва паміж маладымі і старэйшымі. Толькі за пару апошніх гадоў праз „Цаглінкі" правінулася пад 10 маладых спевакоў і мы іх нават жэнім. Бяда, што моладзь выязджае ў гарады на адукацыю і ізноў трэба шукаць новых маладых спевакоў.

— Пазней Вы пачалі працаваць яшчэ і з „Васілёчкамі", а цяпер састаўляеце таксама акампанемент „Рэху пушчы" і „Курантам".

— Пасля мяне бралі як скорую дапамогу. Калі дырыжорам „Васілёчкаў" перастаў быць Уладзімір Сахарчук, папрасілі мяне ў студзені 2000 года давесці гэты калектыў да фестывалю „Беларуская песня" і я астаўся працаваць з бельскім калектывам на 8 гадоў, займаючыся ўвесь час з „Цаглінкамі". Дырэктар ГДК Андрэй Скепка папрасіў, каб я састаўляў акампанемент гайнаўскаму хору і я іграю ў ім ужо паўтара года, а пасля стаў іграць таксама ў „Курантах".

— Прыходзілася Вам займацца з дарослымі спевакамі і дзеткамі. Як бы Вы ацанілі ўзровень спеву беларускіх калектываў Беласточчыны?

— Узровень музычнай падрыхтоўкі беларускіх калектываў на Беласточчыне і ўвогуле ў Польшчы ніжэйшы чым у Беларусі. Асабліва гэта тычыцца дзяцей, моладзі, але нават саракагадовых і пяцідзесяцігадовых людзей. У Польшчы мала музычных школ, а па вёсках практычна няма іх нідзе. Затое ў Беларусі амаль кожная вёска са школай мае базу да музычнай падрыхтоўкі вучняў. Дзеткі павінны ў школах музычна развівацца і вучыцца ігры на інструментах. Голас і спеў закладваюцца ад маленства, а ў прадшколлях і падставовых школах мала тут вучобы спеву пад наглядам прафесійных настаўнікаў музыкі. Зусім інакш справа маецца са старэйшымі людзьмі, што збіраліся па вёсках і спявалі ад душы, бо яны ў маладосці вырабілі навык спеву. Калі гаварыць пра аўтэнтычны фальклорны спеў, з якім выступаюць напрыклад „Арэшкі", ці „Дабрывада", то яго ўзровень не горшы, чым у Беларусі, а тут такога спеву нават больш чым у сярэднім у нас. У Беларусі толькі на Гомельшчыне, Брэстчыне і часткова на Гродзеншчыне старэйшыя людзі больш масава патрапяць яшчэ спяваць аўтэнтычныя фальклорныя песні. Калі гаварыць пра аўтэнтычны спеў сярод маладых, то на Беласточчыне вельмі ўдала выступае з ім „Жэмэрва", але ў Студзіводах ёсць музычна адукаваныя апекуны.

— Можа аднак вернемся да Вашай асобы. Ці ў Вашай сям'і былі таленавітыя музыканты, ад якіх Вы маглі пераняць музычныя здольнасці.

— Я нарадзіўся ў Будах, на Магілёўшчыне. На баяне іграў мой дзядзька, мая бабуля спявала, а бацька Яўхім іграў на балалайцы і на гармоніках. Па лініі бацькі ў нас было многа музычных самавукаў. Першым маім настаўнікам музыкі была мая бабуля. Яна спявала, а я пад яе спеў іграў на гармоніках. Я рос, а дзядзька майго бацькі, што жыў у Маскве, перадаваў мне розныя гармонікі, на якіх я вучыўся іграць. Спачатку гэта былі нагубныя гармонікі, а пасля вялікія з нямецкім і венскім строем. Калі не было каму іграць на вясковых мерапрыемствах, паслалі мяне на курсы ў Горкі. Там вучыў іграць на інструментах выкладчык музычнай школы і ён падгаварыў бацьку выслаць мяне ў музычную школу, дзе я з адукацыяй справіўся за чатыры гады. Пазней я закончыў Музычнае вучылішча ў Гродне і здабыў вышэйшую адукацыю па спецыяльнасцях дырыжора хору, выкладчыка па класе баяна і духавых інструментаў.

— Ваша жыццё спалучанае з музыкай. Ці Вашы дзеці пераняялі ад Вас музычныя здольнасці?

— Мой малодшы сын Саша закончыў музычную школу і часткова пайшоў па маіх слядах, бо працуе ў Мінску музычным харэографам. Старэйшы сын Андрэй таксама закончыў музычную школу, але памяняў крута, бо займаецца спортам і медыцынай. Аднак так атрымалася, што мая жонка працуе музыкам-гісторыкам. Магу таксама пахваліцца, што мая ўнучка Кацярына Мяжэнная, якой 14 гадоў, была ў верасні гэтага года фіналісткай на ўзроўні нашай краіны, гэта значыць у першай дзесятцы з усёй Рэспублікі Беларусь у „Еўрафэсце". Арганізуецца ён дзеткам да 15 гадоў, а яго цэнтральныя спаборніцтвы праходзілі на Украіне, куды паехаў толькі адзін удзельнік з Беларусі.

— Калі б Вам яшчэ раз трэба было выбіраць прафесію, ці выбралі б вы ізноў музычную?

— Думаю, што так. Калі б тыя самыя абставіны паўтарыліся ізноў, можа крышачку інакш прайшоў бы я свае жыццё, але прафесію выбраў бы тую самую.

— Якія ў Вас ёсць яшчэ мары і спадзяванні ў прафесійным жыцці?

— Мне хочацца, каб людзі зразумелі, што без песні, без любові да матчынай мовы, да матчынага спеву, да народнай спадчыны мы можам усё гэта загубіць. Трэба намагацца, каб усё гэта асталося не толькі ў нашым жыцці, але і наступным пакаленням. Хацелася б мне таксама, каб як мага лепш спявалі тыя калектывы, з якімі я працую.

— Вы працуеце на Беласточчыне звыш 17 гадоў, а за гэты час узнагароджвалі Вас тут бурмістры, войты і атрымалі Вы дыплом міністра культуры і нацыянальнай спадчыны. Аднак узнагароды гэта не галоўнае. Што Вас трымае тут, на Беласточчыне?

— Чалавек як камень, што абрастае мохам, калі ляжыць на адным месцы. Працуючы з „Цаглінкамі", „Васілёчкамі" і іншымі калектывамі я спаткаў тут многа вельмі добрых людзей і пасябраваў з многімі. Чалавек прывыкае, зжываецца і шкада пакідаць сваіх спевакоў.

— Дзякую за размову і з нагоды юбілею жадаем Вам чарговых поспехаў у прафесійным і сямейным жыцці.

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

Дзень герояў у Вільні

28 лістапада 2009 г. у Таварыстве беларускай культуры ў Вільні адбылася традыцыйная сустрэча, прысвечаная 89-м угодкам Слуцкага паўстання, а таксама знакамітым асобам, што нарадзіліся ці памерлі ў лістападзе месяцы.

Распачаў сустрэчу Хведар Нюнька са звароту старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілы ў сувязі з угодкамі Слуцкага збройнага чыну. Старшыня нагадала, што беларускае замежжа не павінна забываць сваіх мужных продкаў, што са зброяй змагаліся і загінулі за незалежную Беларусь.

Імпрэзу працягнула мастачка Крыстына Балаховіч, якая зачытала зварот арганізацый беларускай дыяспары на імя Літоўскага тэлебачання з нагоды праблемаў беларускай праграмы „Віленскі сшытак". Апошнім часам праграма выходзіць у вельмі нязручны час (пятніца, 14:50), калі бальшыня мэтавай аўдыторыі знаходзіцца на працы, што значна звужае кола гледачоў. Непаразуменне выклікае таксама паўторны выхад праграмы на LTR2 у той самы дзень толькі праз паўгадзіны — а 15:40. На вялікі жаль, „Віленскі сшытак" не даступны ў анлайнавым архіве LTR. Але самае прыкрае тое, што супрацоўнікі праграмы вось ужо як паўгода не атрымліваюць кампенсацыі за працу. Стварылася вельмі сур'ёзная пагроза сыходу прафесійных журналістаў і спынення існавання беларускага эфіру ў Літоўскай Рэспубліцы. Пад зваротам паставілі свае подпісы Таварыства беларускай культуры, ТБМ Віленскага краю імя Францішка Багушэвіча, Згуртаванне беларускіх арганізацый Літвы, Віленскае беларускае згуртаванне палітычных вязняў і ссыльных, Аб'яднаны цэнтр беларускіх ініцыятыў „JuBIC" і шмат іншых арганізацый.

Крыстына Балаховіч таксама распавяла пра выдатнага беларускага мастака Пётра Сергіевіча. Беларускі талент нарадзіўся паблізу возера Нарач у 1910 г, а ў Вільню трапіў амаль дваццацігадовым юнаком. Пётра Сергіевіч скончыў Віленскі ўніверсітэт, дзе выкладаў прафесар аддзялення прыгожых мастацтваў Фердынанд Рушчыц. Працы мастака былі пазней прадстаўлены на шматлікіх міжнародных выставах.

У міжваенны час П. Сергіевіч быў чальцом Беларускага навуковага таварыства, на грамадскіх пачатках супрацоўнічаў з Беларускім музеем у Вільні, дзе захоўваліся і ягоныя працы.

Пасля вайны больш 40 гадоў беларускі мастак жыў на Антокалі ў двухпавярховым доме, амаль насупраць палаца Сапегаў. Там яго наведвалі выдатныя мастакі Беларусі і Літвы. Маючы за плячыма 76 гадоў, Пётра Сергіевіч памёр у Вільні ў лістападзе 1984 г., дзе і быў пахаваны на вайсковых могілках.

Пасля смерці мастака паўстала пытанне аб стварэнні дома-музея на кватэры П. Сергіевіча. Віленскія беларусы прыклалі шмат намаганняў, каб ажыццявіць гэтую задуму. Па ініцыятыве ТБК і пры фінансаванні беларускай амбасады ў Літве была нават выкуплена палова памяшканняў. Але, на вялікі жаль, праз непаразуменне са сваякамі дом-музей не быў створаны, а разам з гэтым шматлікія працы выдатнага мастака былі вывезены ў Польшчу.

Малады грамадскі дзеяч з Вільні Зміцер Талкачоў распавёў пра чыннасць Вацлава Ластоўскага. Вядомы беларускі палітык і навуковец нарадзіўся 8 лістапада 1883 года ў засценку Калеснікаў Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. У 1902 г. Вацлаў Юстынавіч уступіў у Польскую сацыялістычную партыю ў Літве. У 1904-1905 гг. слухаў лекцыі ў Пецярбургскім універсітэце. З 1906 г. у Рызе, дзе далучыўся да мясцовага беларускага руху. З сакавіка 1909 г. у Вільні. У 1909-1914 гг. працаваў

Зміцер Талкачоў

сакратаром газеты „Наша ніва", рэдагаваў газету „Гоман" (1916-1917). У час Першай сусветнай вайны заставаўся ў Вільні, кіраваў „Беларускай кнігарняй" і Беларускім выдавецкім таварыствам. У сакавіку 1918 г. кааптаваны ў Раду БНР. У лістападзе 1918 г. увайшоў у склад Літоўскай Тарыбы. У снежні 1919 г. узначаліў Кабінет міністраў Народнай Рады БНР. Арыштаваны польскімі ўладамі 17 снежня 1919 г., вызвалены ў лютым 1920 г. Затым пераехаў у Рыгу, потым у Коўна. Удзельнічаў у арганізацыі антыпольскага партызанскага руху. 20 красавіка 1923 г. падаў у адстаўку з пасады прэм'ер-міністра БНР. У 1923-1927 гг. выдаваў часопіс „Крывіч".

Пасля палітычнага перавароту ў Літве (17 снежня 1926 г.) у красавіку 1927 г. пераехаў у БССР. Працаваў дырэктарам Беларускага дзяржаўнага музея, загадчыкам кафедры этнаграфіі пры Інбелкульце. З 1928 г. акадэмік БелАН. Быў неадменным сакратаром Інбелкульта. Вызвалены ад гэтай пасады 20 лістапада 1929 г. 21 ліпеня 1930 г. арыштаваны ДПУ БССР па справе „Саюза вызвалення Беларусі". 6 снежня 1930 г. пазбаўлены звання акадэміка. Пастановай Калегіі АДПУ СССР ад 10 красавіка 1931 г. высланы на 5 гадоў у Саратаў. Паўторна арыштаваны 20 жніўня 1937 г. 23 студзеня 1938 г. прыгавораны да

Крыстына Балаховіч

расстрэлу.

Наступную прамову меў старшыня Таварыства беларускай культуры Хведар Нюнька, які ўзгадаў добрым словам св. памяці Сяргея Карніловіча. Слынны дзеяч беларускага замежжа нарадзіўся ў лістападзе 1929 года на Слонімшчыне. Гарачы віхор вайны занёс яго, як шмат іншых адданых беларусаў, спачатку ў Нямеччыну, а потым у ЗША. З прыватнай ініцыятывы Сяргея Карніловіча ў г. Кліўлендзе быў створаны знакаміты сёння Грамадскі цэнтр „Полацак". Тут на амерыканскай зямлі паўстала людная беларуская калонія, была пабудавана

Юрась Юркевіч

беларуская праваслаўная царква. На пачатку 1990-х гадоў грамада „Полацка" стала адным з асноўных носьбітаў непарыўнай традыцыі беларускага нацыянальнага руху і застаецца такой па сённяшні дзень. Сяргей Карніловіч памёр у кастрычніку 1993 г.

Напрыканцы імпрэзы студэнт ЕГУ Юрась Юркевіч прадставіў для першага паказу дакументальны фільм „Булак-Балаховіч. Генерал няскончанай вайны". Стужка цікавая для беларускага гледача таму, што ў ёй, бадай упершыню, візуальна паказана гісторыя Асобнага Атрада БНР і Беларускай Саюзніцкай (народнай) Арміі.

У стужцы выкарыстана сапраўдная кінахроніка з першым „бацькам" Беларускай Дзяржавы, прадстаўлены аўтэнтычныя мясціны, звязаныя з вайсковай чыннасцю генерала. Кінахроніка была знята дацкімі добраахвотнікамі падчас вайны за незалежнасць Эстоніі супраць Чырвонай Арміі. Пасля вайны стужка трапіла спачатку ў Данію, адтуль у Канаду, дзе і была знойдзена ў 1990-я гады эстонскімі даследчыкамі.

У фільме паказаны памяшканні штаба Асобнага Атрада БНР у Таліне, сядзіба другой жонкі Станіслава, мясціны памяці ў Пскове, Варшаве і Пінску. На фотаздымках можна было пабачыць нават браняпоезд Булак-Балаховіча „Талабчанін". На цікавых фотаздымках паказаны палкоўнік Кастусь Езавітаў у вайсковай форме БНР узору А. Луцкевіча ды Рада беларускай калоніі ў Рызе разам з палкоўнікам Мінгрэльскім — прадстаўніком Асобнага Атрада Балаховіча.

Кожнае фота мае ўжо сваю асобную гісторыю. Напрыклад, здымак генерала Станіслава Булак-Балаховіча, што паказаны паводле сцэнарыя фільма пасля вызвалення Пінска ад чырвоных, з'яўляецца адзінай ягонай фатаграфіяй у генеральскай вайсковай форме Беларускай Народнай Арміі. Фотакартка зроблена была ў самім Пінску, відаць, адразу пасля ўцёкаў саветаў і падорана ротмістру Мураўёву на памяць аб гэтай перамозе. Пазней фота трапляе ў ЗША, дзе і захоўваецца па сённяшні дзень у прыватнай калекцыі.

Карціна „Булак-Балаховіч. Генерал няскончанай вайны" здымалася больш за год у Беларусі, Польшчы, Эстоніі і Расеі. Каманда адмыслоўцаў пры дапамозе навуковага кансультанта Уладзіміра Ляхоўскага вельмі ўдала апрацавала архіўныя дакументы, фота і гістарычны тэкст. Фільм можна лічыць удалым дадаткам папярэдняй стужкі С. Ісакова „Слуцкі збройны чын" (2008) і кнігі Алега Латышонка „Жаўнеры БНР" (2009).

У стужцы генерал БНР апавядае аб сваім жыцці ад першай асобы, за аснову тэксту ўзяты ўласнаручны жыццяпіс Булак-Балаховіча. Аўтары ўпершыню далі „права голасу" гістарычнай постаці пасля больш чым 80 гадоў калі не цкавання, дык замоўчвання. Стужка мае шанц абвастрыць праблему вяртання беларускага вайсковага дзеяча ў нацыянальную гістарыяграфію і прапануе новую інтэрпрэтацыю змагання за беларускую дзяржаўнасць. Рэжысёр фільма — Сяргей Ісакоў, сцэнарый — Уладзімір Халіп, даўжыня 64 хвіліны, 2009 год.

Пасля прагляду прысутныя задавалі шмат пытанняў Юрасю Юркевічу. Датычылі яны шлюбаў і нашчадкаў С. Булак-Балаховіча, адносін Балаховіча з Мікалаем Юдзенічам, акалічнасцей пераходу Асобнага Атрада БНР з Эстоніі ў Польшчу, нацыянальнага складу фармаванняў Булак-Балаховіча. Выступоўца адказаў на ўсе пытанні разгорнута, падчас дыялогу былі падняты новыя цікавыя тэмы, прадстаўлены заўвагі да стужкі.

Юрась ЮРКЕВІЧ

„...жаляў і любові час не ссячэ”

Смерці ў Паэта няма —
Ёсць нараджэнне!
Я. Янішчыц

19 снежня спаўняецца гадавіна з дня смерці выдатнай беларускай паэтэсы, перакладчыцы, выкладчыцы і проста цудоўнага чалавека — Ніны Мацяш.

65 гадоў зямнога жыцця адвёў ёй неміласэрны лёс. Але яна не скарылася перад яго выпрабаваннямі: невычэрпны аптымізм даваў ёй сілы, а любоў да людзей і да жыцця мацавала характар і гартавала волю: „...іду і шукаю прычыны для радасці, бо іншага шляху, каб жыць, няма”.

На здымку: Тамара Лаўранчук і Ніна Мацяш, 17 верасня 2007 г., Берасцейскі ўніверсітэт, Адукацыйны цэнтр ім. Уладзіміра Калесніка (дзень 75-годдзя Уладзіміра Калесніка)

Мінуў год без Ніны, без яе выйшаў апошні зборнік вершаў „У прыгаршчах ветру”, без яе рыхтуецца да друку наступны нумар „Жырандолі”.

Чытаю і перачытваю яе вершы і не перастаю здзіўляцца мудрасці яе слоў, чуласці і глыбіні пранікнёнасці ў свет чалавечай душы.

Нам — гарэць,
і падаць,
і ўзнімацца,
І праклінаць свой лёс, і пець хвалу!
На радасці не можам расстарацца,
Жыццё,
ну што ж — пакутамі хвалюй!

У электронным лісце, дасланым Генадзю Праневічу пасля адыходу з жыцця Алега Лойкі, Ніна напісала: „Ніхто не падкладзе ані пад каго сваіх рук і не затрымае ў мусовай дарозе падарожніка ў вечнасць, якімі, урэшце, ёсць усе мы разам і кожны паасобку, покуль не адбудзем уласнай радоўкі”.

Яна сваю радоўку адбыла дастойна і да апошніх дзён глядзела на свет і на людзей даверліва і спагадліва, таму так хораша і лёгка было з ёй сябраваць. Чытаныя-перачытаныя лісты яе — узор чалавечай прыязнасці і душэўнага хараства: „радуюся тваёй радасці”, „гарнуся душой да светлай душы тваёй”, „дай Бог Табе моцнага здароўя, лёгкага, трывалага ступання далей па сваёй жыццёвай сцежцы, спакойнай сілы несці ўканаваныя смуткі і заўсёднай гатовасці быць адкрытай дзеля шматлікіх радасцей!”

Апошні ліст датаваны 16 лістапада 2008 года.

Мілая Тамарачка!

Даруй за похапак гэтых радкоў: я ў цайтноце...

20-21-га (два дні) у Вялесніцы ды ў Пінску ладзіцца юбілей Жэні Янішчыц. Запрошаная і я, то калі будзе транспарт, патрэбна з'ездзіць. А паперш — падрыхтавацца... Калі 21-га, у дзень Твайго юбілею, я не адазвуся да Цябе тэлефонным званком, значыць, я ў Пінску. Спадзяюся, карцінкі мае своечасова дойдуць да Цябе. Зрабіла дзве: адну з дасланага Табой зязюлінага, здаецца, пер'я, а другую з галубінага. Няхай яны цешаць Цябе, раз'яснёваюць будзённы затурбаваны настрой, дадаюць узнёсласці Тваёй чулай, светлай душы. Калі хочаш, можаш падарыць адну з іх сваёй Наташы. Наагул, распараджайся імі, як заўгодна, — Ты гаспадыня!

Яшчэ раз ласкава вітаю Цябе, зычу добрага здароўя і ўсемагчымага анёльскага спрыяння. І дзякуй Табе, галубка, за Тваё прыхільнае і да мяне шчырае сэрцайка і дарагое мне зычлівае слоўка Тваё — тэлефоннае, друкаванае, субяседнае!

Цалую — Ніна

Ніна заўсёды была прыхільніцай высокачалавечых адносін паміж людзьмі, асабліва з тымі, каго яна вельмі паважала. „У разе з Іванам Антонавічам (Брылём — Т. Л.) была гэткая паўната адносін, пры якой зусім не маюць значэння зямныя прасторавыя і часавыя вымеры. Раздзеленыя сотнямі кіламетраў мы маглі не бачыцца гадамі, але тое не замінала нам невыхільна заставацца ў прасторы духоўнай роднасці, шчырай зычлівасці і сімпатызавання, у святлоце ўзаемарадавання і ўдзячнасці”.

У гэтым — уся Ніна — непаўторная, светлая, чулая, вытанчаная.

Пройдуць гады і людзі разбяруць на цытаты радкі яе вершаў, у якіх яна мудра заўважала: „рота плачам не паправіць”, „у кожнага свой смех і свае слёзы”, „усё звычайна ў гэтым свеце: і першы ўсхліп, і ўздых апошні”, „спакон вякоў было такое: смяюцца людзі, людзі плачуць”, „чалавек адно датуль шчаслівы, покуль сам умее шчасце даць”. Гэты пералік можна працягваць бясконца, як бясконца можна чытаць і перачытваць яе творы, чэрпаючы ў іх сілу і мудрасць: „Жыццё стамляе, Мама. Не стамляе і не стамляецца адна любоў”.

Тамара ЛАЎРАНЧУК

Той, хто хоць крышачку цікавіцца сучаснай беларускай эстрадай, па меншай меры нешта чуў пра гурт „Палац”. Яго яшчэ называюць легендай беларускай этнамузыкі. Ён быў створаны ў 1992 годзе прафесійнымі музыкамі, што ўжо мелі вопыт работы ў разнастайных музычных стылях. Асновай для аб'яднання стаў беларускі аўтэнтычны фальклор, што выконваўся музыкамі як у арыгінальным гучанні, гэтак і ў разнастайных стылістычных апрацоўках.

Доўгае жыццё гурту — не зусім звычайная з'ява. Шмат музычных калектываў распадаюцца праз некалькі гадоў пасля стварэння, хутка дайшоўшы ў сваім творчым развіцці да не надта высокага апагея.

Разам з тым склад „Палаца” з бегам часу мяняўся і з яго выйшла нямала знаных музыкаў, якіх потым параскідаў лёс. Так, спявачка Вераніка Круглова цяпер жыве ў Берліне, удзельнік гурту Юрась Белякоў — у Амерыцы, а Юры Выдронак і Зміцер Вайцюшкевіч заняты сваімі праектамі. Таксама ў свой час гурт стаў пачаткам для такіх музычных праектаў як „Крыві” і „Юр'я”.

Магчыма, зразумець, якім чынам удаецца гурту „Палац” так доўга трымацца на сцэне, дапаможа іх сайт, які месціцца ў інтэрнэце па адрасе http://palac.org.

Найвялікшае адрозненне сайта „Палаца” ад сайтаў іншых музычных гуртоў гэта агульнае непадабенства на такія віртуальныя прадстаўніцтвы. Першая старонка сайта спачатку ўяўляецца нейкай справаздачай з канцэрта. Толькі потым, калі пачынаеш круціць колка „мышкі”, разумееш, што ўсё там напісанае — пра гурт „Палац”.

Верхняя частка першай старонкі сайта, што ў сваю чаргу падзяляецца на дзве, адразу распавядае пра апошнія навіны і паведамленні з жыцця не толькі „Палаца”, але і іншых музычных калектываў. Далей ідуць, размешчаныя на трох частках выяўлення, невялікія анонсы тэкстаў з іншых рубрык сайта. Дарэчы, выйсці на рубрыкі маюцца і ўверсе выяўлення.

Старонка „Абвесткі” з'яўляецца ў нейкім сэнсе працягам навін, праўда, больш змястоўным. Тут падаюцца не толькі паведамленні аб розных падзеях, напрыклад, інфармацыя аб перыядычных выступах лідэра гурту Алега Хаменкі на радыё „Рацыя”, але і разнастайныя інтэрв'ю і артыкулы пра „Палац”.

Гурт, па ўсім відаць, не надта клапоціць пірацкае найгранне іх песень, якія можна лёгка спампаваць з сайта. Рубрыка „Альбомы” — акурат тое месца, дзе знаходзіцца, напэўна, усё, што выконваў гурт цягам сваёй дзейнасці.

Некаторыя кампазіцыі „Палаца” знаходзяцца ў фармаце MP3. Спампаваць іх можна са старонкі „Музыка MP3”.

Прымаўка „лепей адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць” знаходзіць разуменне ў сучасных музыкаў. Дзякуючы інтэрнэту, мы можам убачыць выступленні „Палаца” без наведвання канцэртных залаў ці чакання пачатку адпаведнай праграмы па тэлебачанню.

Рубрыка „Відэа” змяшчае чатыры відэасюжэты выступленняў, а розныя імгненні выйсцяў гурту на сцэну змешчаны на старонцы „Фота”. Фотасправаздач значна болей чым відэасюжэтаў, і яны дазваляюць атрымаць візуальнае ўяўленне аб тым ці іншым канцэрце.

Пазнаёміцца з тэкстамі песень „Палаца” можна зайшоўшы ў аднайменную падрубрыку ўнізе першай старонкі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

З думкамі пра Афрыку

Барысаўскі футбольны БАТЭ, на жаль, не здолеў адолець бар'ера групавога раўнда футбольнай Лігі Еўропы. Гэта стала вядома пасля матчаў пятага тура. Барысаўцы на полі мінскага стадыёна Дынама саступілі лісабонскай „Бенфіцы” з Партугаліі — 1:2. Першы тайм выніковых стрэлаў не прынёс. А ў другім БАТЭ прапусціў два галы. На 69-й хвіліне пасля ўдару галавой Сяргея Сасноўскага мяч рыкашэтам трапіў ужо ў браму партугальскай каманды. Грэчаскі АЕК на родным стадыёне пацярпеў паразу ад ліверпульскага „Эвертана” — 0:1. Такім чынам становішча ў квартэце „І” зараз наступнае: „Бенфіка” — 12 ачкоў, „Эвертан” — 9, БАТЭ і АЕК — па 4. Апошні тур будзе мець чыста фармальны характар.

А галоўнай падзеяй мінулага тыдня стала лёсаванне фінальнай часткі чэмпіянату свету, які пройдзе бліжэйшым летам у Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы. Падаем поўныя вынікі жараб'ёўкі і паспрабуем разабрацца ў шанцах.

Група А: ПАР, Мексіка, Уругвай, Францыя. Супраць французаў, якія заганным шляхам трапілі на чэмпіянат, будзе хварэць паўплянеты. Скрытым фаварытам групы выглядае Мексіка. Каманда гаспадароў найбольш загадкавая з усіх удзельнікаў. Лепшыя часы Уругвая засталіся ў гісторыі, але моц паўднёваамерыканскай школы агульнавядомая.

Група В: Аргенціна, Нігерыя, Паўднёвая Карэя, Грэцыя. Адну з мацнейшых па падборы гульцоў дружыну — Аргенціну — нельга назваць прэтэндэнтам на золата. Прычынай таму „трэнерская рука” Дыега Марадоны, які папросту няздольны „паставіць” камандавую гульню. Рэальныя шанцы выйсці з групы маюць усе.

Група С: Англія, ЗША, Алжыр, Славенія. На першы погляд, адна са слабейшых кампаній з відавочным лідарам — Англіяй. Але не будзем забывацца пра прагрэс амерыканцаў і пра каманду-сенсацыю з маленькай Славеніі. Алжыр таксама здольны папсаваць нервы іншым.

Група D: Германія, Аўстралія, Сербія, Гана. Досыць роўны падбор спаборнікаў. Немцам пры наяўнасці грозных форвардаў можа забракнуць стваральнікаў хаўбекаў, аднаго Міхаэля Балака малавата. Гана здольная як на фурор, так і на поўны правал. Сербы вылучаюцца роўным складам і моцным характарам. Аўстралія падаецца „цёмным конікам”.

Група Е: Нідэрланды, Данія, Японія, Камерун. Адзін з мацнейшых і роўных квартэтаў. І непрадказальных. Тым не менш фаварытам напэўна будзе Галандыя, найцяжэй ёй справіцца будзе з блізкай Даніяй. Камерунцы будуць традыцыйна залежаць ад уласнага настрою, японцы пастараюцца ўзяць жалезнай дысцыплінай.

Група F: Італія, Парагвай, Новая Зеландыя, Славаччына. У чэмпіёнаў свету італьянцаў не павінна ўзнікнуць сур'ёзных праблемаў на першым этапе. Кваліфікаваны і тытулаваны трэнер Марчэла Ліпі плюс шырокі выбар выканаўцаў на ўсе пазіцыі таму гарантыяй. Славакам будзе цяжка выбіць моцны калектыў парагвайцаў.

Група G: Бразілія, КНДР, Кот д'Івуар, Партугалія. Гэтую кампанію ўжо „ахрысцілі” групай смерці. Загадкавым карэйцам адведзена роля статыстаў. Кот д'Івуар — самая моцная афрыканская каманда, але ці здольная яна перамагаць прызнаных грандаў?

Група Н: Іспанія, Швейцарыя, Гандурас, Чылі. Амаль іспанскамоўная група са стылёва аднароднымі зборнымі. Чэмпіёны Еўропы напэўна без праблемаў возьмуць першае месца, „іншародныя” ж швейцарцы выглядаюць асноўнымі прэтэндэнтамі на другую пуцёўку.

Цікава, за каго будзе перажываць на чэмпіянаце бальшыня беларусаў у сітуацыі, калі ніхто з суседзяў на мундыяль не трапіў?

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Шанц на поспех

Гайнаўскі малочны кааператыў — сучаснае прадпрыемства прыстасаванае да еўрасаюзных санітарных патрабаванняў. Карыстаецца яно мадэрнізаванымі тэхналагічнымі лініямі і кваліфікаванымі спецыялістамі. На працягу пяцідзесяцігадовай дзейнасці кааператыў заваяваў пашану і давер кліентаў як на айчынным, так і на замежным рынках. Прадукты Гайнаўскага кааператыва высакаякасныя, экалагічныя, таму што адкормліванне жывёлы адбываецца традыцыйным спосабам і на экалагічных кармах. Вылучаюцца яны своеасаблівым смакам і пахам. Выраб праходзіць паводле сістэмы HACCP. На рынак пастаўляюцца сыры жоўтыя (цвёрдыя), абястлушчаны тварог, сухое малако, смятана ды іншае. 60% вытворчасці прызначаецца на айчынны рынак. Апошняе высылаецца на экспарт у такія краіны як Венгрыя, Чэхія, Расея, Галандыя, Германія, Італія і Алжыр. Кааператыў лічыцца значным вытворцам у коле экспартных пастаўшчыкоў і займае дзевятае месца ў маштабе краіны. Сфера дзейнасці прадпрыемства даволі шырокая. Скупка сыравіны вядзецца на тэрыторыі Гайнаўшчыны і сумежных паветаў: Бельскага (гміны: Орля, Бельск-Падляшскі, Боцькі, Браньск і Вышкі); Беластоцкага (Гарадок, Міхалова, Юхновец-Касцельны, Заблудаў, Васількаў і Супрасль); Сакольскага (Крынкі, Шудзялава) і Сямятыцкага (Мілейчычы, Нурэц-Станцыя, Дзядковічы і Гродзіск).

Гайнаўскі малочны кааператыў гуртуе 1500 пастаўшчыкоў, якія з'яўляюцца членамі кааператыва (у параўнанні з мінулым годам іх лік зменшыўся на 200 чалавек). Незалежна ад таго скупка сыравіны ў агульным маштабе панізілася адно на 3%, затым павысілася на 9,3% ад паасобных вытворцаў. На спад паўплываў пенсійны ўзрост землеробаў, якія не знайшлі наследнікаў для падтрымкі жывёлагадоўлі. Маладыя з вёсак уцякаюць у горад або падаюцца за мяжу, дзе больш даступны рынак працы і там абзаводзяцца сем'ямі.

Сёлета натура не паспрыяла сялянам. Па прычыне дажджлівага надвор'я не быў сабраны першы пакос травы, ды не кожны меў магчымасць загатовіць сілас, паколькі не хапала ўласных машын для такога віду працы, а сельскагаспадарчыя паслугі сталі надта дарагімі, прычым старэйшыя сяляне не былі ўпэўнены да такага корму. У пастаўцы малака вядучае месца займае гміна Нарва (16%), затым Гайнаўка (13%) і Чыжы (10%). У траўні спыніў пастаўку апошні вытворца з Белавежы. Варта адзначыць, што ў васьмідзесятых гадах у Белавежскай гміне было больш за 200 пастаўшчыкоў малака.

Члены кааператыва карыстаюцца Фондам развіцця жывёлагадоўлі і Фондам узаемнай дапамогі. Першы працуе на аснове добраахвотных складчын. Члены ўплачваюць штомесячна 15 зл. і могуць карыстацца беспрацэнтным крэдытам для развіцця гаспадаркі. Калі хто захоча выпісацца, тады пасля месячнай заявы яго ўзносы будуць вернуты.

Фонд узаемнай дапамогі прызначаны на мадэрнізацыю гаспадарак і пабольшанне статка. Пазыкі тут абкладзены 5-працэнтнай стаўкай у маштабе года. Члены кааператыва ахвотна карыстаюцца такімі крэдытамі для развіцця і мадэрнізацыі гаспадарак, закупкі сельскагаспадарчых машын ці правядзення неабходных інвестыцый.

— Поспехам лічу развіццё прадпрыемства, — кажа старшыня кааператыва Вера Паўлючук. — Для гэтай мэты неабходныя мадэрнізацыя і чарговыя інвестыцыі.

Гайнаўскі малочны кааператыў пачаў мантаж абсталявання для падрыхтоўкі вады, якая застаецца ад загушчвання сыроваткі (каля 120 тыс. літраў). Будзе яна выкарыстана для мыйкі аўтацыстэрнаў і змывання падлогі ў вытворчых цэхах. Дазволіць гэта зэканоміць расходванне вады, зменшыць адплыў каналізацыйных сцёкаў у гарадскую ачышчальню, што ў агульным падліку панізіць кошты. Чарговай інвестыцыяй з'яўляецца аўтамыйка аўтацыстэрнаў. Абедзве інвестыцыі будуць закончаны ў гэтым годзе.

Сёлета быў здадзены ў карыстанне цэх засолкі сыроў, купілі аўтацыстэрну для малака і апаратуру для аналізу хімічнага складу малака для мясцовай лабараторыі. На сёлетнія інвестыцыі кааператыў прызначыў 6 мільёнаў злотых, прычым 40% будзе вернутых пасля заканчэння праектаў. Апрача таго прадбачваецца пабудова газавай кацельні і новай прадукцыйнай лініі па вытворчасці сыроў. Першая — шматгадовая, прадугледжана на 2010-2012 гады; другая будзе рэалізавана тады, калі знойдзецца адпаведная колькасць сыравіны. Разлічваецца, што згадныя інвестыцыі будуць рэалізаваны пры дапамозе праграмы „План развіцця сельскіх абшараў" у 2007-2013 гадах.

Уладзімір СІДАРУК

НАШЫ карэспандэнты

У Беластоку ліквідуюць прыпынкі аўтобусаў ПКС!

На беластоцкіх вуліцах вялікі рух усялякіх аўтамашын. Імчацца, абганяюць адна адну, усё некуды спяшаюцца. Мітусня ой якая!

Едуць і не затрымліваюцца ў цэнтры Беластока аўтобусы ПКС. Чаму? Улады горада над Белай лівідавалі прыпынак ПКС за скрыжаваннем Алеі Пілсдскага і вул. Сянкевіча. У цэнтры ваяводскай метраполіі няма для іх месца! Забіралі тут пасажыраў, якія ехалі ў Гайнаўку, у Бельск-Падляшскі, Гарадок і Баброўнікі. Ім было выгадна рушыць адсюль у дарогу дадому. Расклад язды на слупе загадалі забраць прэч.

Неўзабаве нейкі чыноўнік немалога рангу ў гарадскіх уладах даў загад, каб у цэнтры горада — за кругавым скрыжаваннем Алеі Пілсудскага, вул. Браніцкага і вул. Палацовай — не маглі спыняцца аўтобусы ПКС, якія едуць з Бельска-Падляшскага і крыху пазней — з напрамку Гайнаўкі цераз Нарву. Як было сказана, так было зроблена. Пасажыры з паўднёва-ўсходняй ды ўсходняй часткі Падляшскага ваяводства бунтаваліся, але неяк з гэтым змірыліся. Ніхто за імі не заступіўся.

Дыскрымінацыя пасажыраў ПКС з усходняй часткі Падляшша шырыцца далей. Вось 26 лістапада г.г. аўтобус ПКС, які ехаў з Гайнаўкі праз Нараўку, Ляўкова ды Міхалова ў Беласток завёз пасажыраў пад будынак дырэкцыі ПКС па вул. Юравецкай і вул. Фабрычнай. А нам туды не трэба! А яшчэ 21 лістапада г.г. я сышоў з аўтобуса за кругавым скрыжаваннем Алеі Пілсудскага і вул. Палацовай. А тут неспадзеўка — цяпер прыпынак гэты ліквідавалі...

Справай ліквідацыі прыпынкаў аўтобусаў ПКС у цэнтры Беластока, якія едуць з Гарадка, Гайнаўкі, Сямятыч і з Бельска, гэта значыць дзе пражывае найбольш беларусаў у Польшчы, павінны неадкладна заняцца беларускія арганізацыі!

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Купіў — і выматвай!

Мне вельмі часта прыходзіцца рабіць пакупкі ў вялікім магазіне „Каўфлянд" у Бельску-Падляшскім па вуліцы Пілсудскага, 27. Можна тут купіць добрыя і ўсялякія артыкулы, і цэны таксама для кожнага кліента падыходзяць. Але не ў гэтым справа. Калі падыходзіш плаціць і тавар выкладваеш на стужку, то прадаўшчыцы так хутка яго перакладваюць, што або ўспяваеш спакаваць, або і не. І калі кажуць плаціць, дык трэба адразу і спакавацца. Тавар прыходзіцца ў спешцы ўкідваць у сваю торбу абы-як, і гэта чалавека нервуе. Навошта такая спешка? Пакупкі робяць таксама людзі старэйшыя, ім цяжка так хутка забраць тавар. Відаць, з кліентам лічацца, пакуль ён заплаціць, а пасля, калі б маглі, — піхнулі б наском бота яму ў пэўную частку цела — і да пабачэння!

Жэня МАРТЫНЮК

Адгаданка

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

13	14	15	16	17	18	19	20	21	22	23	24	25	26	27	28

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афрыканскую пагаворку.

1. сталіца Азербайджана = 9 _ 8 _ 21 _ 24 _;
2. тонкі слой ледзяных крышталяў на ахаладжанай паверхні = 22_ 1 _ 2 _ 23 _;
3. горад з Ватыканам = 14 _ 15 _ 16 _;
4. музычны твор з некалькіх п'ес, аб'яднаны адзінствам задумы = 7 _ 18 _ 12 _ 13 _ 17 _;
5. крышталікі з цукровых буракоў або цукровага трыснягу = 27 _ 26 _ 11 _ 10 _ 25 _;
6. дзяржава з Сант'яга = 19 _ 20 _ 4 _ 5 _;
7. талон з касы з пацвярджэннем сумы атрыманай за тавар = 6 _ 28 _ 3 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 45 нумара

Дзетдомавец, мішэнь, аканне, шво, чын, вош, трыёд, чалма, Ева, увага.

Рашэнне: **Дзень мае вочы, ноч мае вушы.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Агнешцы Чапко** с Сямятычаў і **Мікалаю Сазановічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

Дзядоўскае турнэ з Анатолем С. (4)

Ганна КАНДРАЦЮК

Адна са сталічных легенд, якая валачэцца слядамі нашага дзядоўскага турнэ, такая: Міра Лукша і Ганна Кандрацюк здзейснілі кулінарны цуд у Гарошкаве. Мы нібыта наварылі там, напяклі і насмажылі яды для сотні народу. Той, хто з'явіўся на святкаванне ў дом паэта, аблізваўся са смакам і хваліў таленавітых кухарак родам з Беласточчыны. Мы не супраць, каб нас хвалілі за талент. Аднак у справе пачастунку ў Гарошкаве выпадае сказаць другое: Гануся і Міра з'елі за сотню народу! А той багаты і смакавіты прыём уласнаручна і ад душы нарыхтавалі Тамара і Валя, родныя сёстры Анатоля.

У гэтым месцы патрэбная яшчэ адна далікатная праўка: мы не такія, каб прысабечваць чужыя легенды пра кулінарныя цуды. Бо кулінарныя цуды, пра што з рукой на сэрцы скажа стары і малы ў Гарошкаве, і нават у суседняй Заспе, належаць аднаму Анатолю Сысу.

* * *

У вагоне № 13 начнога цягніка Гродна-Гомель нас прывітала ветлівая абслуга і незвычайная элегантнасць. Я не верыла сваім нагам, калі па чырвоным персідскім дыванку-ходніку дабіралася ў купэ з месцамі нумар 29 і 30. На вокнах і дзверцах развяваліся пастэльныя фіранкі і занавескі са штучнага шоўку. Міра Лукша, як спецыялістка па ніўскіх гараскопах, таемна ўсміхалася. Ужо тыдзень раней яна ведала што ўначы з 29 на 30 кастрычніка трапіць у цэнтр увагі, а я, паводле яе гараскопаў, у гэту ноч буду спаць як пшаніцу прадаўшы. Пасля, калі ў наш салон зайшоў чарнявы хлапец з валізкай, я ведала, што словы гараскопа здзейсняцца на сто працэнтаў.

— А ці чуеце тое, што я чую, — я пазахаплялася ўголас, — ці чуеце як ветліва, па-беларуску адпраўляюць наш цягнік?!

— Ля! Нават пакецік з пасцелькай па-беларуску падпісалі, — прыкмеціла Міра.

Калі б мы не ведалі, што на апошні цуд шмат гадоў працавала Таварыства беларускай мовы, мы падумалі б што адпраўляюць нас кудысьці ў аблокі...

Ну і той Віктар Казлоўскі, які ад парога выклікаў давер і сімпатыю. Ён не толькі гаварыў на гаворцы як у Баравых пад Семяноўкай (роднай вёсцы Міры Лукшы), дык яшчэ змахваў на майго траюраднага брата Ваню з Вялікіх Тыневічаў. Пасля кароткага знаёмства аказалася, што наш субяседнік працуе на свінаферме каля Гродна, а сам родам з пушчанскай мясціны Барок ля Ціхаволі.

— То з мае да твае вёскі, — Міра Лукша па простай лініі перасякла ў думках польска-беларускую мяжу, — кіламетраў і дзесяці не будзе...

— Я ж чую, што ў нас адна мова, — Віктар адразу пабачыў у нашых асобах дзяўчат свойскай гадоўлі. І, як добры брат, спачатку распавёў нам пра псіхалогію свінні, а пасля пачаў частаваць. Ён разаслаў на стол шаўковую сурвэтку і, як з таго казачнага рога, стаў дабываць са сваёй валізкі самакоцці: дамашнія каўбасы і сала, печаную кураціну, нарачанскі хлеб, кіслыя агуркі, марынаваныя баравікі з пушчы, яблыкі, грушы, цукеркі...

— І заўсёды свініну купляйце ад гаспадара, — Віктар параіў нам як купіць добрае мяса, — і абавязкова, каб у вепрука быў доўгі хвост...

Ад удзячнасці мы хвалілі цэлы жаночы род Казлоўскіх за іх добры смак. Каб падтрымаць настрой свята, Міра Лукша раскрыла свае „Гісторыі з белага свету" і пачала ўголас чытаць бабскую быліцу на семяноўскай гаворцы. А я, згодна з воляй зорак, палезла на вышкі храпці. Перад гэтым *мой траюрадны брат* паслаў мне накрухмаленую пасцельку, якую беларуская чыгунка сервіруе за два долары...

Наш новы знаёмы ехаў наведаць старэнькую маці, якая дажывае пры сястры ў Гомелі. Каб не той памятны здымак у купэ, мы з Мірай зноў падумалі б пра цуд. Пра тое, што нас угашчаў не аднапляменец з Белавежскай пушчы, а пасланец Анатоля С. Так ці інакш, наш вагон № 13, які ў Гродне быў перадапошні, прыехаў у Рэчыцу першым. (*У кніжцы маёй безыменнай, над вершам маім безназоўным, на белай як снег паперы сузор'е ўзышло з трох зорак — трынаццатым знакам „Сэрца" — А. С.*)

* * *

Каб заключыць смакавітую тэму, нам абавязкова падагнаць аповед на 12 гадзін уперад, сесці за сямейны стол Сысоў у Гарошкаве і падняць тост за кухарскія здольнасці Анатоля.

— То я раскажу як ён накарміў мяне крупнікам, — голас узяла Алка, суседка з-за плота.

У Гарошкаве, каго б не спытаць пра Анатоля Сыса, усе распавядуць пра яго кулінарны талент. Успомняць, як ля сваёй белай хаткі частаваў з вялікага чыгуна крупнікам або грыбным баршчом.

— У той дзень я чысціла халадзільнік і выкінула рыбу, — пачала свой аповед Алка, — бо яна ўжо засмярдзела. Я ўзяла рыбіну за хвост і з агідай шпурнула яе за плот. Каб каты пачаставаліся. Каля абеду ў хату зайшоў Толя. Ён сказаў, што гатуе крупнік.

Алка здзівілася, што не просіць яе на абед. Заўсёды ж запрашаў...

— То я сама ўпрасілася!

Сяброўка паэта, ведала як Толя смачна кухарыць. Аб'ядзенне, ясі і пальчыкі аблізваеш...

Але пакуль наша расказчыца з'есць свой крупнік і ў доказ прызнання хлебцам збярэ апошнія кроплі стравы з міскі, мы крышку рассакрэцім канцэпт легендарнай стравы. Калі Анатоль Сыс браўся за кулінарыю, яго адразу акружалі аднапляменцы, часта сытыя і адкормленыя, быццам для якога фокуса. Кожны з іх стараўся дабавіць нешта ад сябе — хто костку з мясам, хто пятрушку з чужога агарода, хто салёны анекдот... Пасля, калі з чыгунка луналі прыемныя пахі, да кухарскага станка ля хаткі нумар 127 цягнулі пілігрымкі. Анатоль частаваў усіх: сытых і галодных, багатых і бедных, падвыпіўшых і цвярозых...

— А што ты ў гэты раз такое дабавіў? — дапытвалася ў Анатоля пасля абеду Алка. — Я і сама такі супчык свайму згатавала б...

— Не пытайся, — пачула ў адказ.

— Чаму?

— Не пытайся, бо пашкадуеш.

— Нічога, няхай званітую. Скажы, што ты такое дабавіў!

— Тваю рыбку, якую ты выкінула катам...

(працяг будзе)

Суседзі з-за плота: Віктар Казлоўскі і Міра Лукша

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Падрыхтоўка дзядоўскіх страў: аўтарка з Ларысай Раманавай

Фота Міры ЛУКШЫ

12.12 — 18.12

(22.03. — 20.04.) У першыя дні тыдня прыбыткі, добрая кан'юнктура. 15-19.12. — шчасце ў каханні. Ідэальны час не толькі на рандэву, але і салодкую ляноту ды адпачынак. Працы шмат, але з поспехамі ўзрастуць твае амбіцыі.

(21.04. — 21.05.) Жалезная воля, вялікія амбіцыі, адважныя крокі. Можаш ствараць цуды, вырваўшыся з абмежаванняў і парваўшы са шкоднымі звычкамі. Можаш шчасце знайсці ў абдымках асобы, на якую ты раней не звяртаў увагі.

(22.05. — 22.06.) Не шукай новых вырашэнняў і прыёмаў, бо старыя і праверраныя акажуцца быць найбольш паспяховымі. Убачыш магчымасці там, дзе нядаўна бачыў адны мінусы. Эмацыянальная раўнавага. Зважай на супрацоўнікаў, якія схочуць пахваліцца тваімі дасягненнямі.

(23.06. — 23.07.) Падтрымліваюць цябе энергетычны Марс і кемлівы Меркурый. Дасі рады з канкурэнцыяй і працаўнікамі. Пераканаеш усіх да сваіх ідэй, справішся з абавязкамі. Моцна схапіся за свае справы — невялікім коштам дасягнеш мэту.

(24.07. — 23.08.) 12 і 13.12. прыемныя сустрэчы і лады ў інтарэсах. Хоць 12-16.12. пазбягай важных вырашэнняў, бо магчымыя страты і памылкі, якія могуць шмат каштаваць. Будзеш пераймацца справамі калег. Гарачыя раманы.

(24.08. — 23.09.) Будуць нагоды паправіць лады ў пары; не пазбягай сур'ёзных размоў. Грошы проста ліпнуць да цябе, і адчуеш сябе багацеем! Будзеш раздаваць касу часам можа і без сэнсу, але зробіш некалькі цалкам трапных пакупак. А настрой — рамантычны!

(24.09. — 23.10.) Будзеш выклікаць зацікаўленне аж да галавакружэння! Старое каханне не ржавее, але неабавязкова мус яго ўваскрашаць. Добры план — гарантыя таго, што з усім паспееш. З 18.12. (да 22.12.) выявяцца людзі нелаяльныя ў адносінах да цябе; незалежна ад прыкрасцей ад іх, будзеш у выйгрышы ты!

(24.10. — 22.11.) Усе поспехі ў прафесіі будуць выключна тваёй заслугай. З 16.12. (да 20.12.) будзеш мець вельмі многа сілы і будзеш здольны да працяглага высілку. Шмат спраў для вырашэння, і многа часу правядзеш па-за домам. Больш уважліва прыгледзься сваім фінансам. Дынамічнае развіццё ў прафесіі, але памятай: канкурэнцыя не спіць!

(23.11. — 22.12.) Будзеш ашчаднейшы, амаль увесь час у дарозе. Ты маэстра ў паказванні сябе, сваіх козыраў. Хвалько з цябе, але ніхто не будзе табе пярэчыць. Заззяеш жыццярадаснасцю і іншыя будуць ахвотна прабываць з табою. Будзь вельмі асцярожны ў фінансавых справах!

(23.12. — 20.01.) Будзеш спакойны, сабраны ў сабе, падрыхтаваны да скоку ў будучыню. Някепская фізічная і духовая форма. У пачуццях прыдасца табе многа цярплівасці і зразумення. Будуць імпанаваць табе багатыя людзі, дык схочаш ім дараўнаць.

(21.01. — 19.02.) Маладзік Месяца ў аптымістычным знаку Стральца дазволіць табе паверыць, што нават найбольш непраўдападобныя мары могуць здзейсніцца. Твае сябры могуць быць шакіраваны тваёй пазіцыяй (12-16.12.): пачнеш чакаць ад іх чагосьці іншага. Адкрыты сэрца і розум — веды самі ўваходзяць у галаву!

(20.02. — 21.03.) Наладзіш цікавыя кантакты, можаш нават пайсці ўверх. Адзін званок ці мейл могуць папхнуць тваю кар'еру. Будзеш незаменнай асобай на працы (не памылі ўстановы з домам!). Пільнуйся ад прастуды, бо хутка можаш злавіць інфекцыю і цяжка перанасеш гарачку!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960